Пролетарии всех стран, соединяйтесь! פּראָלעטאַריער פֿון אַלע לענדער פֿאַראייניקט זיך! Proletarjusze wszystkich krajów, łączcie się! Пралетары ўсіх краёў, злучайцеся!

УМОВЫ ПАДПІСКІ:
На 1 м-ц—90 к.; на 3 м-цы—2 р. 60 к. на 6 м-цаў—5 р.; на 1 год—9 р. 75 к.
Зьмена адрасу: мясцовага—10 к., іншагародняга—20 кап.

ПЛАТА ЗА АБВЕСТКІ:
За радок нонпарэ... 50 кап. Для Мас... Пасярэ... Пры...
Згодн... біраці...

Падпіска і абвесткі прымаюцца: У Гал. Канто... 63, трэці паверх, ад 9 гадз. раніцы да 3-х гадз. ... акруговых гар... Бел. Дзярж. Выдавецтва і ва усіх пашт.-тэл. кантора,

РЭДАКЦЫЯ—Г. МЕНСК, САВЕЦКАЯ, 63.

Зьвязда

Орган Цэнтральн. Камітэту камуністычнае партыі (бальшавікоў) Беларусі і Мен. АК КП(б)Б.

РЭДАКЦЫЯ і ГАЛОЎН. КАНТОРА.
1) Рэдактар прымае ад 11—1 гадз. дня: тэлефон № 10-74. 2) Сакратар рэдакцыі—ад 12 да 2-ое гадзіны дня, тэл. № 6-19. 3) Начны рэдактар (друкарня) ад 6 гадз. веч. тэл. № 6-42
Кіраўн. Гал. Канторай } тэл. № 781.
Кантора абвестак і падпіскі }

СУБОТА, 28 СТУДЗЕНЯ 1928 г.
№ 24 (2831)
Кошт асобнага нумару ўсюды 5 кап.

Год выданьня дванаццаты.

28 студзеня г. г., а 6 гадз. увечары ў памяшканьні **Дому АСЬВЕТЫ** (Камуністычная, № 19)

— АДЧЫНЯЕЦЦА II-гі (ДРУГІ) —

Усебеларускі зьезд МОПР'у

З НАСТУПНАЙ АБВЕСТКАЙ ДНЯ:

1. Міжнароднае і ўнутранае становішча.
2. Даклад Выканкому і ЦК МОПР СССР.
3. Справаздача ЦК МОПР Беларусі і чарговыя практычныя задачы.
4. Справаздача рэвізійнай камісіі.
5. Выбары кіруючых органаў МОПР'у.
6. Выбары на Ўсесаюзны зьезд МОПР'у.

Мандаты дэлегатам выдаюцца ў ЦК МОПР Бел. (вуліца Энгельса, № 25).

Прэзыдыум ЦК МОПР Бел.

Назад у партыю і Камінтэрн!

Сярэдняй „лініі“ ня існуе ў прыродзе прапетарскае дыктатуры. Спрацавацца з партыяй, дапамагчы ёй перамагчы ўсе труднасьці.

Ліст т. т. Зіноўева і Каменева

МАСКВА, 27. У сёньнешнім нумары газэты „Праўда“ надрукован ліст у рэдакцыю за подпісамі Зіноўева і Каменева. Да гэтага ліста рэдакцыя „Праўды“ зьмяшчае наступную ўвагу:

„Праўда“ ў № 13 за 15 студзеня г.г. зьмясьціла дырэктывы трацкістых, якія накіраваны супроць партыі і Камінтэрну і, з другога боку, якія атакуюць таварышоў Каменева і Зіноўева, ганячы іх як „здраднікаў“. Мы атрымалі ад гэтых апошніх „ліст у рэдакцыю“, які лічым неабходным зьмясьціць на старонках «Праўды».

Рэдакцыя з задаваленьнем канстатуе, што Каменеў і Зіноўеў робяць гэтым лістом крок, які аблягчае зварот у партыю ўсіх, хто стаіць на тэй-жа пазыцыі“.

У лісьце Зіноўева і Каменева гаворыцца:

«Два [illegible] ... у „Праўдзе“ ... 1928 году, гэткія няпр... [illegible] насьці поглядаў, што яны ... [illegible], прапануюць апазыцыйным элемэнтам Камінтэрну гэткі няправільны шлях, што могуць толькі прычыніць значную шкоду справе бальшавізму і, апроч таго, зьмяшчаюць гэткае скажонае „тлумачэньне“ нашае пазыцыі, што мы лічым сваім абавязкам адказаць безадкладна.

Мы разышліся з групаю Троцкага, гаворыцца далей у лісьце, непасрэдна па пытаньні аб поўным і сапраўдным падпарадкаваньні пастановам XV зьезду. Або падпарадкаваньне ўсім патрабаваньням XV-га зьезду і цьвёрдае рашэньне спрацавацца з большасьцю партыі, або шлях другое партыі; пытаньне стаяла і стаіць толькі так. Ад гэтага нікуды не пойдзеш. Той, хто і зараз, пасьля XV зьезду, ня бачыць, што пытаньне стаяла і стаіць толькі так,—той асуджан рабіць усё большыя памылкі.

Мы капітулявалі перад УсеКП(б),—пішуць далей Зіноўеў і Каменеў,—лічым гэта адзіным правільным выхадам з цяжкай барацьбы, якая зацягнулася, бо другая партыя ва ўмовах дыктатуры пралетарыяту ня можа быць нічым іншым, як цацкаю ў руках дробна-буржуазнае стыхіі, як зброяй разлажэньня дыктатуры, як перашкодай на шляху сацыялістычнага будаўніцтва.

Адзначаючы далей, што група Троцкага прызнае „адзіную групаю сваіх сапраўдных аднадумцаў у Камінтэрне францускую групу „супроць цячэньня“, і ўзмоцнена абляе Суварына—тую правую групу, якая найбольш далёкая ад бальшавізму,—Зіноўеў і Каменеў задаюцца пытаньнем: капітуляваць перад УсеКП(б) ці перад Суварыным, і адказваюць: „Калі наша партыя вярне нам і нашым таварышом (на што мы спадзяемся) правы членаў УсеКП(б), мы, як бальшавікі, будзем, зразумела, лічыць сваім правам і абавязкам у межах пастаноў УсеКП(б) і Камінтэрну выказвацца наконт таго, што знойдзем памылковым у палітыцы або тактыцы абыякое сэкцыі Камінтэрну і заўсёды будзем спрабаваць выправіць лінію там, дзе яна будзе скрыўляцца. „Выпраўляць“ лінію УсеКП(б) Суварыным сьмеху варта.

Уся сутнасьць справы ў тым, што палітычная групоўка, якая дагаварылася да такіх вывадаў, ў даных канкрэтных абставінах пасьля XV зьезду ня можа ня стаць зброяй дробна-буржуазных сіл супроць УсеКП(б) і Камінтэрну. **Наш вывад з гісторыі двохгадовае барацьбы: назад у партыю і Камінтэрн, трэба спрацавацца з партыяй, трэба вярнуцца ў рады бальшавіцкае партыі, трэба адмовіцца ад процістаўленьня сябе другой партыі, трэба адстайваць свае погляды ў партыі, не ператвараючы гэта права кожнага члена партыі ў фракцыйную барацьбу.**

Ясна, што гэтыя лёзунгі выходзяць з таго, што **УсеКП(б) ёсьць рычаг пралетарскае рэвалюцыі, што СССР ёсьць краіна, дзе будуецца сацыялізм, што наўпрані УсеКП(б) нельга дапамагаць ленінскай справе, а можна толькі губіць яе.**

Што процістаўляць гэтаму аўтары „дырэктыў“? Для дапага пэрыяду: ня другая партыя, а фракцыя, арганізаваная ў такой ступені, каб забясьпечыць сыстэматычнае ўзьдзейнічаньне на партыю, „біць на кіраўніцтва УсеКП(б)“, у надзеі на тое, што „рашучае зрушэньне ўлева“ створыцца ў партыі ў выніку больш крутога націску буржуазіі. Гэта палітыка, гэтыя „дырэктывы“ могуць абапірацца толькі на пераконаньне, што партыя ўсё больш і больш эвалюцыянізуе ў бок тэрмідору. Гэта глыбока няправільная характарыстыка партыі і дзяржавы выходзіць, бясспрэчна, з такога пераконаньня. Такія „вывады“ ў корані не адпавядалі і не адпавядаюць сапраўднасьці, стаяць у сувязі з тым, што „плятформа“ складалася, як дакумант, які процістаўляўся палітыцы ЦК партыі на ўсёй лініі.

У зьвязку з гэтым мы павінны сказаць, што ня можам цяпер адстайваць гэткі дакумант эпохі вышэйшага абвастрэньня фракцыйнае барацьбы, „незалежна ад таго, як трактавалі ў ім асобныя пытаньні. Само сабою зразумела, што ў сваёй працы мы будзем кіравацца пастановамі XV зьезду. У часе XV зьезду мы прадказвалі, што адмова ад поўнага падпарадкаваньня зьезду няўхільна вядзе да скажэньня ўсіх асноўных ідэй ленінізму, усёй пэрспэктывы, усіх ацэнак партыі і дзяржавы. Наш абавязак сказаць зараз усім тым, хто яшчэ ідзе за „дырэктывамі“ групы Троцкага: **не паўлячайце гэтае памылкі, зразумейце няправільнасьць шляху, які яўна вядзе вас ад партыі, зрабеце ўсё неабходнае, каб вярнуцца ў рады партыі, каб спрацавацца з ёю.**

Кожнаму апазыцыянэру мы паўтараем яшчэ раз тое, што ня раз гаварылі ў колах былое апазыцыі ў пэрыяд XV зьезду: **палітычная мужнасьць, паслядоўнасьць ня ў тым, каб упарта ісьці па шляху, які вядзе ўсё далей і далей ад УсеКП(б) і Камінтэрну. Трэба рашыцца спыніцца. Трэба рашыцца павярнуць назад.**

Нельга сумнявацца, што партыя з прыкладу Леніна возьме ўсё тое ад поглядаў меншасьці, што пацьвердзіцца жыцьцём, што акажацца правільным з пункту погляду пралетарскае рэвалюцыі. **Капітуляваць перад партыяй Кастрычнікавае рэвалюцыі ня толькі ня брыдка, але пасьля ўсяго таго, што было, гэта просты абавязак кожнага з нас. Брыдка і ня варта для кольні-небудзь сур'ёзнага пралетарскага рэвалюцыянэра зачыняць вочы на палітычны тупік, куды цягне далейшае процістаўленьне сябе партыі. Сярэдняй „лініі“ ня існуе ў прыродзе пралетарскае дыктатуры. Трэба выбіраць.** Хто гэтага не разумеў учора, той павінен зразумець гэта сёньня, пазнаёміўшыся з „дырэктывамі“. Мы ўпэўнены, што вялізарная частка былое апазыцыі, што ўся ленінградзкая яе частка, што ўсё рабочае асяродзьдзе апазыцыі выбера наш шлях, шлях прымірэньня, спрацаваньня з партыяй. **Дзьверы партыі і Камінтэрну, мы ўпэўнены, будуць расчынены перад кожным з выключаных таварышоў, хто на справе падпарадкуецца партыі. Наша задача, як салдат пралетарскае рэвалюцыі: усімі сіламі дапамагчы партыі ў яе цяжкай працы, дапамагчы ёй перамагчы ўсе труднасьці, што ляжаць на яе шляху, дапамагчы паленінску вырашыць стаўшыя на чаргу новыя пытаньні, давесьці справу Леніна да канца.**

10 ГОД ПАД АБСАЦАМ РУМЫНСКІХ АКУПАНТАЎ

У пакутах мільёнаў насьпяваюць сілы для пераможнае рэвалюцыйнае барацьбы. Бэсарабія вернецца ў адзіную сям'ю Савецкіх Рэспублік

Мітынг пратэсту ў Маскве

МАСКВА, 26. Сёньня адбыўся мітынг пратэсту з прычыны 10-годзьдзя акупацыі Бэсарабіі. Пасьля гэтага з вялікаю прамоваю выступіў тав. Луначарскі.

— З болем у сэрцы, са сьціснутымі кулакамі,—сказаў ён,—мы шлем прывітаньне бэсарабскім братом, цьвёрда перакананыя, што ім ніадоўга чакаць тых рэвалюцыйных зрухаў, якія дадуць магчымасьць Бэсарабіі ўступіць у вялікую сям'ю свабодных Савецкіх Рэспублік.

Прадстаўнік Сялянскага Інтэрнацыяналу Домбаль падкрэсьліў сувязь бэсарабскага пытаньня з сялянскім пытаньнем. Прадстаўнік балканскіх камуністычных партый Кабакчыеў зазначае, што барацьба бэсарабскага народу за нацыянальную незалежнасьць зьяўляецца часткаю агульнай барацьбы балканскіх народаў за нацыянальнае вызваленьне. Прадстаўнік румынскай кампартыі тав. Крычнаў напомніў, што Румынія атрымала смачны кавалак—Бэсарабію, як плату за барацьбу супроць бальшавізму і як узнагароду за ўдзел у будучай барацьбе з СССР.

Пасьля выступленьня Гейлера (Мопр) і Шмэраля (Камінтэрн) сход аднагалосна ўхваліў рэзалюцыю пратэсту супроць акупацыі Бэсарабіі, а таксама пастанавіў паслаць наступную тэлеграму 4-й сэсіі ЦВК АМССР, якая зараз адбываецца:

„Сёньня, на правым беразе Днястра, сьвята здраднікаў і гвалтаўнікоў і строгае маўчаньне прыгнечаных масс—сялян і рабочых. У пакутах мільёнаў рабочых і сялян Бэсарабіі насьпяваюць сілы для пераможнай рэвалюцыйнай барацьбы. Бэсарабцы і працоўныя Масквы, сабраўшыся ў дзень 10-годзьдзя чорнай румынскай акупацыі Бэсарабіі на мітынгу пратэсту, вітаюць 4-ю сэсію ЦВК АМССР. У гаспадарчым і культурным росьце Савецкае Малдавіі, ва ўзмацненьні ўсяго Савецкага Саюзу—надзея на вызваленьне Бэсарабіі. Прысутныя мітынгу шлюць гарачае прывітаньне стогнучым братом за Днястром і вераць у набліжэньне дня, калі рабоча-сялянская Бэсарабія, скінуўшы ненавіснае ярмо захопнікаў, вернецца ў адзіную сям'ю Савецкіх Рэспублік“.

Юды скардзяцца...

ВЕНА, 26. 24-га студзеня ў Кішынёве адбыўся сход былых дэпутатаў „Сфатул Цэрыя“ (бэсарабскі нацыянальны збор, які ў 1918 годзе ўхваліў пастанову аб „дабраахвотным“ далучэньні да Румыніі). На сходзе была ўхвалена пастанова падаць румынскаму ўраду ў сувязі з 10-годзьдзем анэксіі Бэсарабіі мэмарандум з радам скарг. Гэтыя скаргі зводзяцца да наступнага: урад назначае ў мясцовыя органы праўленьня людзей з старой Румыніі; Бэсарабія перажывае надзвычайна цяжкі эканамічны крызіс з прычыны няправільнага ажыцьцяўленьня аграрнай рэформы (так, уласьнікі, у якіх забіраецца зямля, не атрымліваюць належнай кампэнсацыі; сяляне, надзеленыя зямельнымі вучасткамі, не атрымалі неабходнага інвэнтару і патрэбнага ім таннага крэдыту); з Бэсарабіі абыходзяцца, як з калёніяй.

Аб гаспадарчай працы парт'ячэек

Пытаньне непасрэднай, практычнай працы парт'ячэек па гаспадарчым будаўніцтве ўвесь час было ў цэнтры працы партыі. Шэраг пастаноў плэнумаў ЦК і зьездаў партыі гэтаму пытаньню аддавалі шмат увагі і вызначылі правільную мэтавую ўстаноўку—пашырэньне і ўдасканаленьне сацыялістычных элемэнтаў нашае гаспадаркі.

Партыя з гэтай задачай пасьпяхова спраўлялася і спраўляецца.

Але сучасны стан народнае гаспадаркі, шэраг труднасьцяй, пэрыяд рэканструкцыі народнае гаспадаркі, які мы зараз перажываем, праблема культурнай рэвалюцыі, без якой немагчымы далейшы пасьпяховы ўзрост—усе гэта вымагае ад партыі яшчэ большага напруджаньня сваіх сіл, яшчэ большага ўдзелу партыйных арганізацый у непасрэднай практычнай працы па гаспадарчым будаўніцтве.

Гэта праца набывае асаблівую вострасьць у вёсцы, якая ў сваім далейшым разьвіцьці ўпіраецца ў абсалютную неабходнасьць перабудаваньня форм гаспадараньня—пераходу ад раздробных, адзінаасабовых гаспадарак да буйной калектыўнай гаспадаркі. Далейшая праблема машынізацыі вёскі, пераход на культурныя формы землякарыстаньня вымагае ад дзяржавы новых буйных капітальных укладаньняў.

Мы жывем ва ўмовах, калі разьлічваць на знадворную дапамогу немагчыма. Усе тыя дасягненьні, якія ў нас маюцца, зьяўляюцца вынікамі нашых уласных старраньняў, намаганьняў рабочых і сялян. І таму цяпер, калі пралетарская дзяржава пераходзіць у чарговы пэрыяд сацыялістычнага будаўніцтва, яна разьлічвае толькі на шчырае падтрыманьне сваіх пачынаньняў з боку рабочых і сялян. Выпускамі пазык і рэалізацыяй іх у асяродзішчы працоўных мы павялічваем магчымасьць хутчэйшага і больш пасьпяховага сацыялістычнага будаўніцтва. Задача партыйных арганізацый—быць непасрэднымі праваднікамі пачынаньняў партыі ў самых шырокіх гушчах працоўных.

І ня толькі справа рэалізацыі пазык павінна заняць увагу партарганізацый, наадварот, цяпер, як ніколі, партыйныя ячэйкі, асобныя партыйцы павінны наблізіцца да ўсіх галін разьвіцьця эканомікі нашай краіны.

Праца вытворчых камісій і эканомнарад на вытворчасьці, змаганьне з бюракратызмам, скажэньнямі лініі партыі ў савецкіх установах, ажыўленьне сельскіх саветаў на падставе ўцягваньня ў іх працу бядняцка-серадняцкіх мас, рэарганізацыя іх працы на грунце большага набліжэньня да гаспадарчага ўпарадкаваньня вёскі, каапэраваньне насельніцтва і асабліва вясковай беднаты, палепшаньне стану каапэрацыі, павялічэньне яе грашовых магчымасьцяй, шляхам павялічэньня паявых узносаў і мэтавых укладаў і г. д.—павінна цяпер з асаблівай увагай праходзіць праз удзел і кіраўніцтва партыйных ячэек.

У практыцы працы некаторых нашых вясковых партыйных арганізацый усё яшчэ можна бачыць парадную бліскучасьць, захапленьне адцягненымі пытаньнямі, вырашэньне пытаньняў наогул без прыстасаваньня іх да канкрэтнай штодзеннай сучаснасьці. З гэтымі праявамі мы павінны зараз рашуча змагацца. Трэба заўсёды памятаць, што «важнейшай задачай партыйнай працы ў вёсцы зьяўляецца далейшае палепшаньне якасьці і паглыбленьне масавай працы, дабіўшыся ў ёй большай чуласьці да запытаньняў мас і большай палітычнай мабілізацыі шырокіх батрацкіх, бядняцкіх і серадняцкіх мас вакол важнейшых практычных і гаспадарчых задач, вакол падняцьця абароназдольнасьці краіны і сацыялістычнага перабудаваньня ўсяе народнае гаспадаркі». (XI зьезд КП(б)Б).

Гэтае пытаньне роўназначна ня толькі для вёскі, але, наогул, да пытаньня гаспадарчага сацыялістычнага будаўніцтва. Чарговым лёзунгам партыі на бліжэйшы час павінна быць праверка нашай дзейнасьці, нашай працы па гаспадарчым будаўніцтве, узмацненьне тэмпу працы на гэтым надзвычайна важным вучастку сацыялістычнага будаўніцтва.

Мукдэнская зграя цэрпіць паражэньне ад паўднёўцаў

„Чырвоныя пікі“ рэарганізуюцца ў „народныя карпусы“

Фын Юй сян і Ен Сі-шан занялі рад гарадоў

ШАНХАЙ, 26. Па зьвестках нанкінскага агэнцтва, войскі ФынЮй-сяна занялі Цжэчжоу ў правінцыі Шансі. Усходні флянг войск Фын Юй-сяна заняў Цьзяочжоу ў 120 кілёмэтрах на паўночны ўсход ад Кайфыну, у правінцыі Шандунь. На тэрыторыі, занятай Фын Юй-сянам, атрады «чырвоных пік» рэарганізуюцца ў «народныя карпусы». Падрабязнасьці рэарганізацыі невядомы.

Па неправераных зьвестках, войскі Ен Сі-шана адрэзалі мукдэнцам адступленьне ў 75 кілёмэтрах на поўдзень ад Баоцінфу (правінцыя Чжылі). Калган заняты авангардам шансійцаў з боку Жэхола.

НАНКІНСКІ ЎРАД СЛАБЫ

ПЕКІН, 26. „Пекін Энд Цяньцьзін Таймс“ (рэакцыйная ангельская газэта, што выходзіць у Цяньцьзіне), камэнтуючы ў перадавіцы прапанову лёндонскага „Таймс“ аб устанаўленьні кантакту з Нанкінам, піша: „Таймс“ падтрымлівае гнілое дрэва. Нанкінскі ўрад—установа вярэальная, ня маючая аўтарытэту. Вайсковыя сілы Чан Кай-шы нязначныя. Гуансійская групоўка ўзмацняецца. Таму найлепшай палітыкай у сучасны момант зьяўляецца палітыка чаканьня.

БАЙ ЦЗУН-ЧЫ ЗАХАПІЎ ЧАНША

ТОКІЕ, 26. Па зьвестках агэнцтва Сімбун-Рэнго, войскі Бай Цзун-чы ўзялі ўчора Чанша (галоўны гандлёва-прамысловы цэнтр правінцыі Хунань). Бай Цзун-чы выдаў пракламацыю, у якой абвінавачвае камандуючага хунаньскімі войскамі Хо цьзяна ў прыналежнасьці да «чырвоных». У сапраўднасьці, Хо Цьзян самы непрымірымы працівік рабочага і сялянскага руху, ён кіраваў контр-рэвалюцыйным пераваротам у Ухане ў ліпені—жніўні 1927 году, бязьлітасна расправіўшыся з дзеячамі рабочага руху.

Працэс шпіёна Скальскага

МАСКВА, 26. Карэспандэнтам „ТАСС“ атрыманы зьвесткі аб паасобных момантах трэцяга дня працэсу Скальскага 20-га студзеня.

Скальскі дарэмна прабаваў адхіліць абвінавачаньні ў контр-рэвалюцыйных дзеяньнях і сувязі з біскупам Дубоўскім. Разблаваны відавочнасьцю ўлік аб патаемных зносінах з Дубоўскім, аб характары гэтых зносін, Скальскі выгукнуў:

— Біскуп Дубоўскі заўсёды быў ня ў меру вёрткі, вібы шарманка. Заўсёды ён стараўся непатрэбным афішаваньнем і рознымі абежнікамі паказаць сваю палітычную ролю.

Аднак, такая рэзкая характарыстыка біскупа Дубоўскага наўрад ці зьмягчыць відавочнасьць таго, што і пасьля дэкрэту рымскага папы аб падзеле жытомірскай эпархіі (увосень 1925 г.) Скальскі чамусьці падтрымліваў зносіны з біскупам Дубоўскім.

ПОЎДЗЕНЬ ПАВІНЕН АБ'ЯДНАЦЦА

ПЕКІН, 26. Шанхайскі карэспандэнт „Юнайтэд Прэс“, падагульваючы погляды, выказаныя ў інтэрв'ю з ім выдатнымі кітайскімі палітычнымі дзеячамі, падкрэсьлівае, што пэрспэктывы вашпай перамогі над Поўначчу зусім „безнадзейныя. Карэспандэнт зазначае, што, па думцы дзеячоў, з якімі ён гутарыў, Нанкін павінен сканцэнтраваць усю сваю энэргію і дабіцца аб'яднаньня Паўднёвага Кітаю. Той факт, што Чан Кай-шы зьяўляецца прыхільнікам утварэньня партыйнага ўраду, ацэньваецца як адзнака слабасьці Чан Кай-шы. Эўропа-ж, па думцы вышэйзазначаных колаў, усё больш і больш у сваіх сымпатыях схіляецца да тых дзеячоў Кітаю, якія ажыцьцяўляюць фактычна індывідуальную дыктатуру.

Зах. Беларусь перад выбарамі

Апячатаньне беларускага выбарчага камітэту

ВІЛЬНЯ, 26. Гэтымі днямі ў памяшканьне беларускага акруговага выбарчага камітэту (беларускія нацыяналістыя) у Наваградку зьявілася „тэхнічная камісія“, якая, агледзеўшы памяшканьне, апячатала яго.

Не зважаючы на апячатаньне памяшканьня, камітэт працуе ўвесь час.

Сяляне гоняць польскіх агітатараў

ВІЛЬНЯ, 26. Орган беларускіх нацыяналістых „Сялянская Ніва“ паведамляе, што ў беларускія вёскі панаехалі агітатары з ППС, „Вызваленьня“, з „беспартыйнага блёку супрацоўніцтва з урадам“ (пілсудчыкі) і з прадажніцкага палёнафільскага „краёвага аб'яднаньня“ Умястоўскага. Аднак, сяляне, навучаныя горкім вопытам выбараў 1922 году, проста гоняць прэч гэтых агітатараў.

Да працэсу „Грамады“

ВІЛЬНЯ. „Сялянская Ніва“ паведамляе, што гэтымі днямі ў Вронак у Лукіскі астрог прывезены б. паслы Тарашкевіч, Рак-Міхайлоўскі, Валошын і Мятла і грамадзяне Бурсэвіч і Акінчыць, арыштаваныя ў сувязі з працэсам «Грамады». Працэс праз некалькі тыдняў пачнецца ў Вільні.

Зьезд літоўскіх эміграйтаў.

БЭРЛІН, 26. З 22-га па 24-га студзеня ў Бэрліне адбываўся зьезд літоўскіх эмігрантаў. Зьезд прайшоў пад лёзунгамі: барацьба супроць спроб фальсыфікаваць настроі літоўскіх эмігрантаў на карысьць анты-літоўскіх замыслаў Польшчы, барацьба супроць польскага імпэрыялізму, барацьба супроць фашызму ў Літве.

Зьезд ухваліў дзьве вялікія палітычныя рэзалюцыі. Першая з іх выкрывае гэтак званы „зьезд літоўскіх эмігрантаў у Рызе“ і здрадніцкую работу агэнтаў польскага імпэрыялізму сярод літоўскіх эмігрантаў, а таксама агалашае лёзунг—абарона незалежнасьці Літвы супроць польскага імпэрыялізму. Другая рэзалюцыя гаворыць аб неабходнасьці барацьбы за зьвяржэньне фашысцкага ўраду ў Літве. Гэта рэзалюцыя заяўляе, што барацьба павінна весьціся аднача‑сова на два фронты—супроць польскага імпэрыялізму і супроць літоўскага фашызму.

Міжнароднае становішча СССР

РОСТ САВЕЦКА-ЯПОНСКАЕ ПРЫЯЗЬНІ

ТОКІЁ, 26. Орган дзелавых колаў „Ямата“, камэнтуючы ў перадавіцы назначэньне прэм'ера Танака паўнамоцным прадстаўніком СССР тав. Траяноўскім, піша, што неабходна было-б арганізаваць савецка-японска-кітайскую канфэрэнцыю для абгаварэньня пытаньняў аб захаваньні міру на Далёкім Усходзе і аб эканамічным разьвіцьці Сібіры, Манголіі і Манчжурыі.

Прагрэсыўная „Ніці-Ніці“, абгавараваючы пытаньне аб узаемаадносінах паміж Японіяй, Кітаем і СССР, піша: „Па зьвестках, Чжан Цзо-лін заявіў, што неабходна быць на варце, бо весткі аб назначэньні Кухара міністрам замежных спраў адбіваюць рост прыяцельскіх адносін паміж Японіяй і СССР. Газэта заяўляе, што японскі ўрад не павінен дазваляць, каб манэўры Чжан Цзо-ліна маглі пашкодзіць савецка-японскім узаемаадносінам, нават, калі-б Чжан Чзо-лін сапраўды знайшоў падтрыманьне з боку часткі японскіх мілітарыстых“.

ЛІТОЎСКАЯ ГАЗЭТА АБ ПОЛЬСКА-САВЕЦКІХ АДНОСІНАХ

КОЎНА, 21. Орган народнікаў-сялян «Летувос Жыніос» прысьвячае артыкул польска-савецкім адносінам, у якім разглядае прычыны, што перашкаджаюць заключэньню польска-савецкага дагавору аб ненападзе. Адзначаючы залежнасьць польскай палітыкі ад палітыкі Францыі і Англіі, газэта падкрэсьлівае, што „Варшаве, якая называе сябе бар'ерам супроць СССР, няміўуча гэтую ролю адыграць“. У заключэньне газэта заяўляе, што палітыка Польшчы зьяўляецца сур'ёзнай перашкод й для палітычнай стабілізацыі ва Усходняй Эўропе.

Аб мерах разьвіцьця экспарту

(У парадку абгаварэньня)

У друку ўжо досыць многа і падрабязна пісалася аб важнасьці і значэньні для народнае гаспадаркі разьвіцьця экспарту.

Асабліва вялікае значэньне мае разьвіцьцё экспарту другарадных відаў сырцу, якія ў значнай частцы застаюцца нескарыстанымі ў сялянскай гаспадарцы.

Нашы экспартныя пляны ў сучасны момант абхапляюць нязначную частку экспартных магчымасьцяй. І калі-б мы навучыліся выцягваць з сялянскае гаспадаркі ўсё тое, што яна можа даць, дык наш экспарт змог-бы ўзрасьці ў вельмі вялікай ступені.

Да апошняга часу нашы загатоўчыя органы таксама ўдзялялі далёка невыстарчальную ўвагу пытаньням экспарту. І толькі пасьля таго, як была арганізавана камісія па садзейнічаньні экспарту пры Эканамічнай Нарадзе і пры акрвыканкомах, мы заўважваем зрух сярод загатоўшчыкаў у пашырэньні сваёй работы ў галіне загатовак экспартных відаў сырцу. Але асноўная задача невыстарчальнасьці разьвіцьця гэтае работы заключаецца ў тым, што ў нас вельмі слаба вывучаны паасобныя раёны рэспублікі ў сэнсе магчымасьцяй загатовак экспарту, а таксама і само насельніцтва вельмі дрэнна ведае, што можа быць выкарыстана для экспарту і як тэхнічна падрыхтоўваць паасобныя віды сырцу.

Гэтае становішча гаворыць аб тым, што нам неабходна як мага шырэй разгарнуць работу па высьвятленьні насельніцтву, што і як трэба загатаўляць для экспарту.

Мне здаецца, што было-б надта мэтазгодна стварыць пры РВК ячэйкі дапамогі разьвіцьцю экспарту. У гэтыя ячэйкі можна было-б прыцягнуць сельскую інтэлігенцыю—настаўнікаў, дактароў, аграномаў, якія маглі-б вельмі шмат дапамагчы вывучэньню дадага раёну ў сэнсе магчымасьцяй загатовак экспартных відаў сырцу.

Таксама, у гэтыя ячэйкі можна было-б прыцягнуць і вясковы актыў, які шмат мог-бы дапамагчы разьвіцьцю экспартных загатовак.

У задачы гэтых ячэек павінна ўваходзіць: 1) вывучэньне раёну і 2) распаўсюджваньне сярод насельніцтва ведаў тэхнічнага значэньня аб спосабах загатоўкі экспартных відаў сырцу.

Пры належным кіраўніцтве гэтымі ячэйкамі з боку акруговых камісій па дапамозе экспарту можна было-б іх работу зрабіць вельмі карыснай для разьвіцьця экспарту.

Пажадана, каб па гэтым пытаньні выказаліся як нашы загатоўшчыкі, так і працаўнікі вёскі.

Консан.

НАЧНОЕ РАДЫЕ

Паны хочуць ануляваць выбарчы сьпіс рабоча-сялянскага адзінства

ВАРШАВА, 27. У зьвязку з высунутаю ў галоўным выбарчым камітэце прапановаю ануляваць сьпісак рабоча-сялянскага адзінства, на рабочых акраінах Варшавы адбыліся ўчора стыхійныя дэманстрацыі пратэсту. Дэманстранты былі разагнаны паліцыяй.

* * *

ВАРШАВА, 27. Па распараджэньні ўлад канфіскавана прадвыбарная адозва камітэту рабоча-сялянскага адзінства.

У Сьвенцянах арыштаваны былы пасол незалежнай сялянскай партыі Шапель.

У Лідзе арыштаваны былы пасол, член сялянскага саюзу Дуброўнік.

Гандаль паміж СССР і Зл. Штатамі

НЬЮ-ЁРК, 15. У 1927 годзе ў Зл. Штатах было разьмешчана савецкіх заказаў на суму 31.199.834 даляры супроць 8.681.412 даляраў у 1926 г.

Гэта сума ня ўключае закупкі бавоўны тэкстыльным сындыкатам, якая за апошні год дасягнула 42 мільёнаў даляраў супроць 35 млн. даляраў у 1926 годзе. Агульны зварот гандлю СССР са Зл. Штатамі складае за 1927 г. каля 100 млн. даляраў супроць 70 млн. даляраў у 1926 г. і 48 млн. даляраў ў 1913 г.

Небясьпека зацяжкі ў польска-літоўскіх перагаворах

ПАРЫЖ, 27. „Пці-Журналь“ паведамляе, што Пілсудзкі адправіў учора Літве другую ноту. Далей газэта піша: „У Лёндане лічаць зацяжку польска-літоўскіх перагавораў вельмі небясьпечнай. Калі Вальдэмарас і надалей будзе стаяць на сваёй непрымірымай пазыцыі, дык Польшча зьвернецца ў Лігу Нацый з просьбаю нанова разгледзець пытаньне аб польска-літоўскіх адносінах на сэсіі савету Лігі, які адбудзецца ў сакавіку“.

Вальдэмарас у Штрэзэмана

БЭРЛІН, 26. Адбылася першая гутарка паміж Штрэзэманам і прыехаўшым у Бэрлін літоўскім прэм'ерам Вальдэмарасам. У літоўскіх колах у Бэрліне мяркуюць, што Вальдэмарасу ўдасца прыйсьці да згоды з Штрэзэманам наконт асноўных прынцыпаў гандлёвага і арбітражнага дагавораў паміж Нямеччынай і Літвой.

*** „Клясавае супрацоўніцтва“ на практыцы ***

(Ад нашага лёнданскага карэспандэнта)

Гваздом дня ангельскага палітычнага жыцьця зьяўляецца курс на «прамысловы мір». «Прамысловаму міру» прысьвячаюцца перадавіцы газэт, у якіх зьмяшчаецца клясавае супрацоўніцтва, як адзіны сродак выратаваньня ангельскае прамысловасьці. Яму сьпяваюць урачыстыя гымны ўсе паборнікі «Вялікае Англіі», пачынаючы ад прамыслоўца Альфрэда Монда і канчаючы дзеячамі Генэральнае Рады трэд'юньёнаў.

Аб тым, у што выліваецца на практыцы «мір у „прамысловасьці», гаворыць прыклад паліграфічнае вытворчасьці, дзе супрацоўніцтва паміж прадпрыемцамі і рабочымі налічвае ўжо шматгадовую даўнасьць.

Ангельская паліграфічная вытворчасьць адносіцца да ліку галін прамысловасьці, якія стаяць досыць добра. Заработная плата друкарскіх рабочых крыху вышэй іншых рабочых. Друкары зьяўляюцца ў пэўнай ступені «арыстакратыяй» ангельскае рабочае клясы. У прафэсыянальных арганізацыях друкароў пануюць самыя прайдохі рэфармістыя і рэакцыянэры. Вось ужо некалькі год, як іх сіламі створан так званы «аб'яднаны прамысловы савет паліграфічнае вытворчасьці», у які ўваходзяць прадстаўнікі як прадпрыемцаў, так і прафсаюзаў.

Задачай гэтага савету і зьяўляецца ажыцьцяўленьне «клясавага супрацоўніцтва» ў паліграфічнай прамысловасьці.

Ня так даўно савет выдзяліў асобную «камісію па палепшаньню ў вытворчасьці», якая на днях агаласіла даклад аб мерапрыемствах, неабходных, на яе думку, для росквіту паліграфічнае вытворчасьці.

Камісія лічыць неабходным у першую чаргу правесьці сурову рацыяналізацыю паліграфічных прадпрыемстваў. З другога боку, камісія крывадушна заявіла, што ў аснове яе работ ляжыць прынцып скарачэньня беспрацоўя. Між тым, капіталістычная «рацыяналізацыя» няміўуча цягне за сабою звальненьне лішніх рабочых, што супярэчыць прынцыпу скарачэньня беспрацоўя. Гэту супярэчнасьць камісія, зразумела, абыходзіць маўчанкаю.

Далей камісія лічыць неабходным стварыць «дарадчыя камітэты рабочых» для «арганізаванага выкарыстаньня прапаноў рабочых па палепшаньні вытворчасьці»—свайго роду вытворчыя нарады на рэфармісцкі лад. Не спадзяючыся на празмерную актыўнасьць рабочых і на іх зацікаўленасьць у павялічэньні прыбыткаў гаспадара, аўтары дакладу ставяць стаўку на прэміяваньне рабочых за ўдалыя прапановы. «Дарадчыя камітэты» павінны, па думцы аўтараў праекту, замяніць існуючыя цэхавыя сходы, якія маюць мэтаю абарону прафэсыянальных інтарэсаў рабочых. Аўтары праекту маюць усе асновы не падкрэсьліваць гэтай замены. Прадпрыемцам выгадней замест прафэсыянальных арганізацый рабочых мець справу з органамі са строга дарадчымі тэхнічнымі функцыямі, тым больш, што дзякуючы раздачы прэмій, якія па сутнасьці справы зьяўляюцца ўзаконенай сыстэмай подкупу паасобных рабочых, дарадчыя камітэты будуць цалкам знаходзіцца ў руках прадпрыемцаў.

Нарэшце, даклад, праўда, у некалькі цьмянай форме, упамінае аб неабходнасьці ўдзелу рабочых у прыбытках.

Вось да чаго зводзіцца ажыцьцяўленьне «клясавага супрацоўніцтва» ў прамысловасьці. Зьнішчэньне прафэсыянальных арганізацый, поўная залежнасьць рабочых ад прадпрыемцаў, рацыяналізацыя вытворчасьці з адпаведным павялічэньнем беспрацоўя,—сыстэма подкупу і раздачы рабочым пры дапамозе так званага ўдзелу ў прыбытках,—вось што азначае «прамысловы мір».

ВЯСКОВЫ КАМУНІСТЫ--НА ГАСПАДАРЧЫ ФРОНТ!

„Удзел камуністых у сельска-гаспадарчых каапэратывах і калектывах свайго раёну або вобчаства бязумоўна абавязковы. Роўным чынам абавязковым для іх зьяўляецца пачатак у стварэньні гэтых арганізацый, калі іх няма".

(З РЭЗАЛЮЦЫІ АДЗІНАЦЦАТАГА ЗЬЕЗДУ РКП(б)

Самым істотным недахопам у працы вясковых ячэек КП(б)Б да гэтага часу зьяўляецца слабая ўвязка іх палітычнай работы ў вёсцы з штодзеннымі пытаньнямі гаспадарчага і культурнага будаўніцтва.

Шмат самых надзенных пытаньняў, якія хвалююць вёску, часта застаюцца па-за ўвагаю вясковых ячэек. У гэтай справе трэба самым рашучым чынам і ў самыя бліжэйшыя часы дабіцца карэннага пералому.

XV зьезд УсеКП(б) і XI зьезд КП(б)Б паставілі, як самую асноўную, канкрэтную задачу ў вёсцы—разгортваньне сацыялістычнага будаўніцтва, на падставе аб'яднаньня раздробленай сялянскай гаспадаркі і стварэньня буйное калектыўнае гаспадаркі.

Асноўны лёзунг для вёскі зараз: «Вёска, уперад да буйной калектыўнай гаспадаркі». Галоўнаю задачаю вясковых ячэек—ажыцьцяўленьне гэтага лёзунгу.

В. Кнорын

БЛІЖЭЙ ДА ГАСПАДАРЧАЙ ПРАЦЫ

Асноўны недахоп партыйнай работы ў вёсцы заключаецца ў **адрыве ячэек ад сельска-гаспадарчай вытворчасьці.**

Ячэйкі займаюцца, галоўным чынам, пытаньнямі палітычнымі, міжнароднымі, унутрыпартыйнымі, чарговымі кампаніямі і г. д. А самыя надзенныя пытаньні, якімі жыве і якія хвалююць вёску, звычайна застаюцца па-за ўвагаю вясковых ячэек. Ад гэтага ў большасьці выпадкаў нашы ячэйкі слабыя і ўплыў іх на сялянства слабы.

Але горш за ўсё гэта тое, што нашы ячэйкі ў вёсцы **адарваны ад перадавой сельска-гаспадарчай вытворчасьці,** *ад новых сялянскіх вытворчых арганізацый сацыялістычнага тыпу, — земляробскія камуны, арцелі, таварыствы. Вельмі часта ячэйкі нават ня ведаюць калектываў свайго раёну і зусім ня цікавяцца іх жыцьцём.*

Атрымліваецца самая рэзкая, кідаючаяся ў вочы, супярэчнасьць: вясковыя камуністыя земляробы, прадстаўнікі партыі, якая будуе сацыялізм, якія самі прапаведуюць сацыялістычнае будаўніцтва ў вёсцы, гэтыя камуністыя земляробы стаяць у баку ад калектыўнага руху і займаюцца ўласнаю прыватнаю гаспадаркаю.

Толькі невялікая частка вясковых членаў партыі знайшла выхад з гэтае нецярпімае супярэчнасьці—адзіны выхад: гэтыя таварышы арганізавалі з сваіх прыватных гаспадарак калектыўныя гаспадаркі, уступілі членамі ў калектыўныя гаспадаркі. Але пераважаючая большасьць камуністых-земляробаў усё яшчэ застаецца ў радох гаспадароў-адзінак, хоць-бы і зьяўляючыся членамі тых ці іншых каапэратываў.

Калектыўны рух у вёсцы шырока разьвіваецца і ўся гэта справа ідзе стыхійна, перакідваецца праз галавы вясковых арганізацый партыі. Калектыўны рух зараз больш усяго церпіць імена **ад недахвату кіраўніцтва, ад адсутнасьці ў яго радох самых перадавых элемэнтаў вёскі, правадыроў вёскі—вясковых камуністых,**

Так далей працягвацца ня можа.

Усе вясковыя арганізацыі партыі павінны зараз-жа, не чакаючы ўказаньняў, прыступіць да практычнай работы па ажыцьцяўленьні лёзунгу, які высунуты 15-м зьездам партыі:

— Вёска, уперад да буйной калектыўнай гаспадаркі.

Трэба, каб усе партарганізацыі ў вёсцы ведалі, колькі і якіх калектываў працуе ў іх раёне, якія з іх „дзікія" (не зьяўляюцца членамі с.-г. каапэрацыі), якая дапамога ім патрэбна, у якія з іх магчымы і неабходны прыём новых членаў, якія новыя калектывы магчыма арганізаваць. Трэба прапрацаваць усе гэтыя пытаньні на радзе сходаў закрытых і адкрытых з прыцягненьнем прадстаўнікоў ад калектыўных гаспадарак, сельска-гаспадарчай каапэрацыі, КСУ і бядняцка-серадняцкага актыву. У мэтах арганізацыі калектываў трэба прыцягнуць у першую чаргу бядняцкія фонды і сродкі КСУ, а таксама дабівацца крэдытаў.

Ня можа быць ніякага сумненьня, што гэтыя пачынаньні знойдуць жывы водгук ня толькі ў масе партыйцаў і камсамольцаў, але і ў значна больш шырокай масе перадавога сялянства, асабліва сярод былых чырвонаармейцаў. Сялянскія гаспадаркі ўзьнімаюцца, накапленьне ў іх расьце і раней ці пазьней перад кожным селянінам, якому ўдалося ўзьняць сваю індывідуальную гаспадарку, паўстае пытаньне: як-жа быць далей? Ці ісьці шляхам далейшага прыватнага накапленьня з перспэктывай папасьці ў кулакі і ўрэшце страціць грамадзкае давер'е, пазбавіцца выбарчых праў? Ці аграмадзіць свае накапленьні з іншымі такімі-ж самымі, як яго, у якім-небудзь вытворчым калектыве?

Зусім ясна, што для ўдзелу камуністых у с.-г. каапэратывах няма і ня можа быць ніякіх затрудненьняў гэтак сама, як і для выяўленьня ініцыятывы з іх боку ў арганізацыі такіх каапэратываў. Пэўныя затрудненьні сустракаюцца толькі для ўступленьня і для арганізацыі такіх вытворчых калектываў (камуны, арцелі), удзел у якіх зьвязаны з спыненьнем самастойнае прыватнае гаспадаркі. Але для прасьцейшых відаў вытворчых калектываў (таварыствы) зусім няма неабходнасьці ў такой крутой ломцы індывідуальнай гаспадаркі. І, урэшце, усе гэтыя затрудненьні, калі яны ёсьць, **з посьпехам перамагаюцца** *сотнямі тысяч беспартыйных радавых сялян, членаў калектываў. Чаму-ж для камуністых-адзінак яны зьяўляюцца неперамоўжнымі?*

Работа вясковых партарганізацый па калектывізацыі сельскае гаспадаркі і кіраўніцтве імі ў гэтай працы павінна быць узмоцнена. У гэтых адносінах трэба дабіцца ва што-б то ні стала **крутога пералому.** *Павінен быць праведзены ў жыцьцё лёзунг 15-га зьезду партыі.*

— Вёска, уперад, да буйной калектыўнай гаспадаркі.

Сельскі камуністы--арганізатар гаспадарчай працы партыі

Работа сельскай партыйнай ячэйкі па ўздыме і калектывізацыі сельскае гаспадаркі толькі тады будзе пасьпяховай, калі ячэйка будзе весьці прапаганду калектыўных форм на аснове жывых канкрэтных прыкладаў. Не загадам і не ўгаворам, а толькі ўдачным практычным прыкладам на аснове гаспадарчай зацікаўленасьці магчыма паступовая сацыялістычная перабудова сялянскае гаспадаркі. Патрэбна, зразумела, і агітацыя за калектыўныя формы, за правядзеньне агрыкультурных мерапрыемстваў, але агітацыя талковая, падмацаваная справаю практычным прыкладам.

У першую чаргу выявіць ініцыятыву ў пераходзе да калектыўных форм, падаць прыклад, як паляпшаць гаспадарку—павінны сельскія камуністыя-гаспадары. Яны павінны стаць начале ўзрастаючага ў вёсцы калектыўна-гаспадарчага будаўніцтва, **быць ініцыятарамі** ў стварэньні новых вытворчых аб'яднаньняў, **весьці за сабою** бядняцка-серадняцкую масу вёскі.

Ці зьяўляюцца сельскія партыйцы такімі ініцыятарамі і кіраўнікамі ў перабудове вёскі?

Нажаль, трэба прызнаць, што ў масе сваёй камуністыя — сельскія гаспадары гэтай сваёй ролі **яшчэ ня выконваюць.** Але з агульнай масы сельскіх партыйцаў вылучаецца ўжо досыць значная група саправдных арганізатараў гаспадарчае перабудовы вёскі, якія сваім прыкладам пасоўваюць уперад разьвіцьцё сялянскіх гаспадарак, зьяўляюцца ініцыятарамі ў стварэньні калектываў і каапэрацыйных аб'яднаньняў. Расьце група партыйцаў, якія пачынаюць у тэй ці іншай меры культываваць сваю гаспадарку, уводзячы шматпольле, травасеяньне, гатункавую жывёлу і г. д. Ёсьць ня мала выпадкаў, калі камуністы сваім прыкладам пабуджае суседзяў-сялян увесьці паляпшэньні ў гаспадарцы.

Вось некалькі такіх прыкладаў: член Луначарскай ячэйкі, Валынецкага раёну, Полацкай акругі, тав. Л., прыгоўшы з Чырвонай арміі, застаў сваю гаспадарку ў стане поўнага развалу, але, дзякуючы ўвядзеньню некаторых паляпшэньняў, дабіўся яе ўзмацненьня. Жывучы ў абшчыне, ён усё-ж засявае канюшыну, набыў малатарню і працуе над арганізацыяй машыннага таварыства. Калі ён упяршыню пасеяў канюшыну, суседзі сьмяяліся з яго, а цяпер самі пераходзяць да сеяньня канюшыны. Гэты партыец карыстаецца сельска-гаспадарчай літаратурай (часопісы).

Тав. Б. з Хоцінскай ячэйкі, Ульскага раёну, Полацкае акругі, увёў поўнасьцю 8-палёвы севазварот, мае пасеку, завёў ангельскіх сьвіней, набыў некаторыя машыны і што цікавей за ўсё—мае сельска-гаспадарчую бібліятэку па ўсіх асноўных пытаньнях сельскае гаспадаркі, выпісвае часопіс «Сам сабе агроном».

Член Гарадзішчанскай ячэйкі, Менскае акругі, старшыня сельсавету зьявіўся ініцыятарам пераходу на шматпольле сваёй вёскі.

У Юзэфаўскай ячэйцы, Полацкае акругі, два партыйцы ўвялі паказальнае кармленьне жывёлы.

Можна прывесьці некалькі прыкладаў, калі камуністыя выявілі сваю ініцыятыву ў пераходзе да калектыўных форм гаспадаркі, будучы арганізатарамі гэтага пераходу.

У Гарадзішчанскай ячэйцы адзін камуністы, гарачы агітатар калектывізму. Ён зьявіўся ініцыятарам у арганізацыі бэканнае арцелі, кіруе сельска-гаспадарчым гуртком, узяў крэдыт на пабудову паказальнага хлява для жывёлы.

Найбольш яскравым прыкладам арганізуючага ўплыву сельскіх камуністых на кольнае сялянства можа служыць Целяшоўская ячэйка, Гомельскае акругі.

Напершае, як рэдкае пакуль выключэньне, **ячэйка ставіла на абмеркаваньне пытаньне аб пераходзе камуністых да культурных спосабаў вядзеньня гаспадаркі.** Падругое — члены ячэйкі дабіваліся значных посьпехаў у паляпшэньні гаспадаркі і часткова ў галіне яе калектывізацыі. Адзін член ячэйкі, перасяліўшыся на пасёлак, арганізаваў меліярацыйнае таварыства, дзякуючы чаму асушана 70 дзесяцін балот.

Паданыя прыклады сьведчаць аб некаторым павялічэньні ролі вясковага камуністага ў справе рэарганізацыі сельскае гаспадаркі.

Але ўсё-ж большая частка сельскіх камуністых па спосабах вядзеньня сваёй гаспадаркі нічым не адрозьніваецца ад агульнае масы сялянскіх гаспадарак, а ёсьць ня мала выпадкаў, калі гаспадарка камуністага вядзецца больш адсталым спосабам, чым у беспартыйных суседзяй. Сярод гэтае групы—значная праслойка беднякоў. І здавалася-б, што яны павінны былі-б быць галоўнымі падбухторшчыкамі арганізацыі калектываў. А між тым—на справе гэтага няма.

Чым можна вытлумачыць такое зьявішча? Часткова гэта тлумачыцца нізкім палітычным і культурным узроўнем партыйцаў, асабліва кандыдатаў, слабою сельска-гаспадарчаю пісьменнасьцю, залежнасьцю ад абшчыны. Але галоўнаю прычынаю, па нашай думцы, трэба лічыць амаль поўную адсутнасьць работы сельячэек у [illegible] ніцтва камуні[illegible] ве паляпшэньня [illegible] і слабасьць работ[illegible] калектыўных форм.

Таму сельскія парт'ячэйкі павінны паставіць перад сабою, як адну з чарговых задач, работу па калектывізацыі і аграмаджаньні гаспадарак партыйцаў і камсамольцаў, узмоцніць кіраўніцтва і дапамогу ім у справе паляпшэньня сваёй гаспадаркі. З гэтаю мэтаю ячэйкі павінны на партнёх ставіць на парадак дня пытаньне аб спосабах паляпшэньня гаспадарак партыйцаў, аб калектывізацыі іх. Акрамя таго, трэба шырэй практыкаваць мэтад вытворчых нарад камуністых і камсамольцаў, якія высунуты ў артыкуле т. Хацімскага («Зьвязда», № 10, 12-га студзеня 1928 году). Ужыць усе меры да ліквідацыі сельска-гаспадарчай няпісьменнасьці камуністых, працуючых у сельскай гаспадарцы, ячэйкі павінны дабіцца, каб усе сельскія камуністыя працавалі ў сельска-гаспадарчых уртках, выпісвалі і чыталі с.-г. літаратуру.

Але галоўнае—трэба імкнуцца да таго, каб сельскія камуністыя і камсамольцы былі ініцыятарамі і правадырамі сялянства ў пераходзе да калектыўных форм гаспадаркі.

Быць падбухторшчыкам, ініцыятарам у справе калектывізацыі сельскай гаспадаркі, павышэньня тэхнікі земляробства, разьвіцьця тэхнічных культур, у арганізацыі машыннага т-ва, грамадзкай запашкі, у правядзеньні масавых агрыкультурных мерапрыемстваў, як зерначыстка, раньні папар, травасеяньне, ужываньне мінэральных угнаеньняў і г. д.—вось найважнейшая задача сельскага камуністага.

Задача-ж сельскай ячэйкі і райкому парадаю, практычным паказаньнем усямерна садзейнічаць і дапамагчы ў гэтым сельскаму камуністаму.

А. Д.

Праца ў вёсцы наогул, і як важнейшая яе частка, гаспадарчая праца—ёсьць самая адказная і неабходная ў сучасны момант праца для камуністых.

Вось чаму трэба, каб праца ў вёсцы захапіла нашу партыю і каб у бліжэйшыя часы лепшыя сілы партыі пайшлі туды на працу. З боку гаспадарчае працы камуністы ў вёсцы абавязаны садзейнічаць узмацненьню ў вёсцы саўгасаў, калектываў, арцеляй, усялякіх відаў каапэрацыі; селянін-камуністы павінен быць перадавіком па тлумачэньні сялянству пастаноў XV зьезду УсеКП(б) аб калектывізацыі сельскай гаспадаркі і СВАІМ ПРЫКЛАДАМ ПАВІНЕН ВЫКЛІКАЦЬ РУХ СЯРОД СЯЛЯНСТВА Ў БОК КАЛЕКТЫВІЗАЦЫІ.

А. Чарвякоў

Буйнейшыя задачы сацыялістычнага будаўніцтва, якія цяпер стаяць перад камуністычнай партыяй, рабочымі і сялянамі, могуць быць вырашаны пры ўмове большай культурнасьці ўдзельнікаў выкананьня гэтых задач. Таму тэарытычная падрыхтоўка членаў партыі, значна большае культурнае абслугоўваньне рабочых і сялян зьяўляюцца галоўнейшай задачай сацыялістычнага будаўніцтва. Асабліва гэта задача востра стаіць у Беларусі, у беларускай вёсцы. Тэмп і якасьць сацыялістычнага будаўніцтва галоўным чынам залежаць ад таго, ці зможам мы высунуць і значна ўперад культурнае абслугоўваньне рабочых і сялян.

Камуністыя ў вёсцы павінны служыць прыкладам правядзеньня галоўнай задачы партыі—калектывізацыі вёскі. Прыкладам можна служыць тады, калі ведаеш ня толькі, што самому рабіць, але і калі можаш расказаць сялянам, што, як і чаму трэба рабіць. Таму тэарытычная падрыхтоўка камуністых на вёсцы, зьвязаная з калектывізацыяй вёскі, зьяўляецца самай галоўнейшай задачай унутрыпартыйнай працы на вёсцы.

Я. Яковлев

Пазыку ўмацаваньня сялянскай гаспадаркі рэалізуем

XV зьезд партыі пытаньню гаспадарчага будаўніцтва вёскі ўдзяліў шмат увагі. Праблема грунтоўнага перабудаваньня вёскі, зьмена форм гаспадараньня, пераход да буйное і калектыўнае гаспадаркі і рад іншых задач паўсталі перад партыяй ва ўсёй вострасьці.

Далейшы ўзрост народнае гаспадаркі патрабуе раду новых капітальных укладаньняў. Мы толькі нядаўна правялі рэалізацыю 200.000.000 пазыкі індустыялізацыі, якая цалкам была разьмешчана сярод рабочых і служачых. Гэтая сума далёка ня вычэрпвае тых патрэб у сродках, якія вымагаюцца сучасным станам народнае гаспадаркі.

Вось чаму і цяпер савецкі ўрад, маючы такую вялізную перад сабой задачу, якая патрабуе шмат сродкаў для яе выкананьня, спадзяецца на рабоча-сялянскія масы. Выпушчаная пазыка ўзмацненьня сельскай гаспадаркі, цалкам накіраваная на арганізацыю раду мерапрыемстваў, якія дапамогуць перабудаваць сельскую гаспадарку на новых лепшых падставах, разьлічана на рэалізацыю ў вёсцы. Сялянства павінна сумленна аднесьціся да сваіх грамадзкіх абавязкаў і, шануючы сваю савецкую рабоча-сялянскую ўладу, прыйсьці ёй на дапамогу, набываючы аблігацыі пазыкі.

На долю партарганізацый, асабліва вясковых, выпадае вялізная праца. Трэба дасканала растлумачыць сялянству ўсю сутнасьць і выгаду для селяніна ад набыцьця аблігацыі пазыкі. Трэба так паставіць працу, каб ня было ніводнага кутка, ніводнага паселішча, жыхары-б якога дакладна ня ведалі аб сялянскай пазыцы. Лёзунг партыі «Ніводнага сялянскага двара без пазыкі» павінен быць як-бы там ні было выканан. Правядзеньне кампаніі па рэалізацыі пазыкі ў сельсаветах ускладаецца на сельсаветы.

Ячэйкі партыі на вёсцы павінны шырока разгарнуць масавую агітацыйную кампанію, ад посьпеху якой у значнай меры залежыць і посьпех рэалізацыі пазыкі. Трэба так паставіць працу, каб ня было ніводнага сялянскага двара, які-б ня быў уцягнены і абхоплены гэтай кампаніяй. Усе віды масавай працы, як хаты-чытальні, насьценгазэты, адкрытыя сходы ячэек, групавая і індывідуальная агітацыя, усялякія гурткі і г. д. павінны быць прыстасаваны для найбольш поўнага і ўсебаковага асьвятленьня перад сялянствам задач і мэт пазыкі.

Партыйцы і камсамольцы на вёсцы павінны асабіста прыняць удзел у набыцьці аблігацый пазыкі. Лёзунг—кожны камуністы на вёсцы, кожны камсамолец павінны абавязкова мець аблігацыю пазыкі ўмацаваньня сялянскай гаспадаркі—павінен як найхутчэй зьдзейсьніцца.

На райкомы і акругкомы ўскладаецца вельмі адказная задача кіраўніцтва гэтай кампаніяй. Непасрэдная дапамога, вылучэньне лепшых таварышоў для агітацыйнай працы ў вёсцы, штодзённы нагляд за працай павінны заняць дамінуючае значэньне.

Пазыка мае вялікае значэньне ў справе сацыялістычнага будаўніцтва, —яе пасьпяховая рэалізацыя дапаможа партыі яшчэ шпарчэй прасунуць наперад справу арганізацыі новага лепшага жыцьця.

Адначасова з кампаніяй па рэалізацыі пазыкі парт'ячэйкам трэба таксама зьвярнуць увагу і наогул на працу сельсаветаў у бок іх ажыўленьня, лепшага і больш грунтоўнага абслугоўваньня сялянскіх мас.

Правільная пастаноўка, шчыры бальшавіцкі ўдзел у гэтай кампаніі парт'ячэйкі, асобных партыйцаў забясьпечаць посьпех.

Пара адмовіцца ад агульшчыны

(Ячэйка КП(б)Б саўгасу „Рым", Капыльскі р., Меншчына)

Асноўныя дырэктывы партыі: аб рэжыме эканоміі, масавай працы, зьніжэньні цэн, рацыяналізацыі апарату, аб працы з беднатою нашаю ячэйкаю не прапрацаваны.

У выніку неразуменьня пытаньня аб працы з беднатою на агульным сходзе ячэйкі ў зьвязку з дырэктывамі АК КП(б)Б, ячэйка дала наступную дырэктыву сельсавету—„Ажывіць работу групы беднаты". Гэта агульная пастанова ні ў якой меры не адпавядае тым задачам па працы сярод беднаты, якія стаяць перад партыяй.

Ячэйка слаба кіравала сельска-гаспадарчым і культурным будаўніцтвам вёскі, у прыватнасьці ня цікавілася земляўпарадкаваньнем.

А. Б.

ЧАРГОВЫЯ ЗАДАЧЫ ПАРТ'ЯЧЭЕК У ВЁСЦЫ

У папярэднім артыкуле*) мы разглядалі зьмест працы сельскіх ячэек па кіраўніцтве гаспадарчым будаўніцтвам вёскі. Дасягненьні ячэек у гэтай працы бясспрэчны. Але было-б няправільна і шкодна зрабіць на гэтай падставе вывад аб у поўнай меры спрыяючым стане гэтага важнейшага участку працы. Наадварот—трэба затрыць увагу вясковых партарганізацый на тых недахопах, якія маюцца ў гаспадарчай працы ячэек. А недахопаў яшчэ шмат.

Самым буйным і асноўным недахопам у кіраўніцтве ячэек гаспадарчым жыцьцём зьяўляецца адсутнасьць у іх хоць-бы прыблізнага падліку ўяўленьня аб дынаміцы эканамічнага росту вёскі. У ячэйках няма сыстэматычнага нагляду за тым, які пласт у яе раёне расьце хутчэй, павялічваецца ці зьмяншаецца колькасьць бясконных і бескароўных гаспадарак, як разьвіваецца арэнда зямлі, за рахунак каго і ў якой меры расьце батрацтва, да каго ідуць с.-г. машыны і г. д. І таму многія мерапрыемствы ячэйка праводзіць без выстарчальнага падліку канкрэтных умоў і абставін свайго раёну, часта выпадкова.

Акрамя таго, трэба паказаць на рад іншых досыць важных недахопаў. Слаба разгорнута праца па калектывізацыі сельскай гаспадаркі, невыстарчальнае кіраўніцтва працай па земляўпарадкаваньні ў сэнсе ўсьвядамляньня і садзейнічаньня на выбар сялянамі форм землякарыстаньня, слаба праводзіцца арганізацыя беднаты для абароны яе інтарэсаў пры земляўпарадкаваньні, праца па гаспадарчай арганізацыі і эканамічнай дапамозе беднаце невыстарчальна энэргічна разгортваецца; наглядаецца рад недахопаў у кіраўніцтве каапэрацыяй, слабая праца па мабілізацыі сродкаў насельніцтва для гаспадарчага будаўніцтва (ашчадныя касы, пазыкі і г. д.).

Усё гэта гаворыць аб неабходнасьці ў далейшым максымальнага ўзмацненьня кіраўніцтва ячэек гаспадарчым жыцьцём вёскі. Пытаньні гаспадарчага і культурнага будаўніцтва павінны быць паложаны ў аснову ўсёй працы сельячэйкі.

На падставе дырэктыў XV партзьезду кожная ячэйка, выходзячы з умоў свайго раёну, павінна адзначыць плян практычнай працы па правядзеньні гэтых дырэктыў у жыцьцё.

У першую чаргу ячэйкі павінны самым дакладным чынам абгаварыць і прапрацаваць пастановы партзьезду па працы ў вёсцы. Гэтыя пастановы вызначаюць увесь напрамак і асноўны зьмест працы партыі на вёсцы на цэлы рад год. Таму трэба дабіцца, каб партыйныя пастановы былі поўнасьцю зразумелы і добра прадуманы кожным вясковым партыйцам і камсамольцам.

Але гэтага мала. Трэба шырока растлумачыць пастановы партзьезду сярод бядняцка-серадняцкіх мас сялянства, трэба даць правільнае тлумачэньне гэтым пастановам, сканцэнтраваць вакол іх грамадзкую думку, дабіцца актыўнага ўдзелу беднаты і серадняка ў практычным ажыцьцяўленьні пастаноў зьезду. Мэтазгодна будзе прапрацаваць асобныя пытаньні, высунутыя зьездам па працы ў вёсцы на сходах і групах беднаты, на раённых канфэрэнцыях груп беднаты, на нарадах вясковага актыву і г. д.

Пад пунктам гледжаньня выкананьня дырэктыў партзьезду сельячэйкі павінны праверыць усю сваю сучасную працу і перабудаваць яе такім чынам, каб яе зьмест адказваў задачам, пастаўленым партыяй.

Канкрэтна перад ячэйкамі паўстаюць наступныя задачы.

Ячэйкі павінны азнаёміцца дэтальна з станам калектыўных гаспадарак і каапэрацыйных аб'яднаньняў (арцелі, машынныя, меліярацыйныя, ільнаводныя і іншыя таварыствы і г. д.), якія ёсьць у раёне ячэйкі.

На падставе гэтага вывучэньня распрацаваць плян практычных мерапрыемстваў па палепшаньні іх працы, высоўваючы пытаньні аб правядзеньні тых ці іншых мерапрыемстваў, у выпадку патрэбы, перад вышэй стаячымі арганізацыямі. Узмацніць сувязь з калхозамі, аказваючы ім усямернае садзейнічаньне. Прадумаць пытаньне аб магчымасьцях узмацненьня калхозаў камуністымі, праводзячы гэта з асаблівай асьцярожнасьцю. Адзначыць спосабы ўзмацненьня палітвыхаваўчай працы ў калхозах. Праверыць склад кіраўнікоў машынных, меліярацыйных і інш. таварыстваў у мэтах яго ўзмацненьня. Дабіцца ўзмацненьня сувязі калхозаў з акружаючым насельніцтвам, ставячы даклады калхозаў аб стане іх гаспадаркі на сялянскіх сходах.

Трэба энэргічней разгарнуць прапаганду неабходнасьці і выгаднасьці калектыўнай гаспадаркі, ставіць даклады аб гэтым на сходах і групах беднаты, уключыць гэту працу ў сыстэму індывідуальнай і групавой агітацыі, асьвятляць пытаньні карыснасьці калектывізацыі ў хаце-чытальні, у сьценгазэце, праз беспартыйных актывістых. Пры чым гэта прапаганда павінна быць не абстрактнай, а будавацца на канкрэтных прыкладах з падлікам магчымасьцяй утварэньня таго ці іншага аб'яднаньня ў пэўнай вёсцы і ў пэўны тэрмін.

З гэтай мэтай пытаньні ўтварэньня вытворчых аб'яднаньняў трэба спачатку дакладна абгаварыць і падрыхтаваць у ячэйцы з практычнага боку, а потым перанесьці на прапрацоўку ў групу беднаты, на сход беднаты, пасяджэньне КСУ ці сельсавету.

Кожная ячэйка, выходзячы з умоў свайго раёну, павінна паставіць перад сабой пэўную задачу: «па працягу 1928 году арганізаваць у такіх-то вёсках такія-та вытворчыя аб'яднаньні (машыннае, ці жывёлаводчае таварыства, арцель і г. д.)». Пры чым, калі ячэйка пачала праводзіць якое-небудзь з гэтых мерапрыемстваў, дык абавязкова павінна даводзіць яго да канца.

Трэба прапрацаваць на партнёх пытаньне аб спосабах палепшаньня камуністымі і камсамольцамі сваіх гаспадарак, вывучыць магчымасьці іх калектывізацыі, праверыць удзел камуністых у сельска-гаспадарчай вытворчай каапэрацыі.

Самым энэргічным чынам разгарнуць працу па каапэраваньні бядняцка-серадняцкіх мас сялянства, асабліва па лініі сельска-гаспадарчай вытворчай каапэрацыі. Праверыць як выкарыстоўваюцца фонды каапэраваньня беднаты, абгаварыць пытаньні далейшага каапэраваньня на сходах і групах беднаты, шырэй прыцягнуць камітэты ўзаемадапамогі да каапэраваньня беднаты. Ячэйкі павінны ўзмацніць працу па зьніжэньні цэн, шырэй прыцягнуць насельніцтва да гэтай працы, дабіцца ажыўленьня крамных рэвізійных камісій, прыцягнуць да працы па зьніжэньні цэн групы беднаты пры каапэратывах, дэлегатак, камсамол, ставіць перад пайшчыкамі даклады праўленьняў і загадчыкаў крамамі аб працы па зьніжэньні цэн. Праводзіць нарады каапэрацыйнага актыву па пытаньнях зьніжэньня цэн і палепшаньня працы каапэрацыі.

Пры ўсім гэтым галоўную ўвагу зьвярнуць на ўцягваньне сродкаў насельніцтва ў каапэрацыю. Энэргічнейшым чынам павесьці працу па павялічэньні і па спагнаньні паявых узносаў, спагнаньні запазычанасьці і па пратэрмінаваных пазычках, па разьвіцьці ўкладных апэрацый у каапэратывах.

Улічваючы вялікае значэньне сыстэмы кантрактацыі, як формы, якая дапамагае вытворчаму каапэраваньню сялянскіх гаспадарак, ячэйкі павінны правесьці шырокую растлумачальную кампанію па пытаньні аб разьвіцьці сыстэмы дагавароў каапэрацыі і дзяржорганаў з сялянамі-вытворцамі на пэўную колькасьць і якасьць прадуктаў (кантрактацыя).

Павінна быць значна ўзмоцнена кіраўніцтва ячэек працаю па земляўпарадкаваньні. Ячэйкі павінны сачыць за падборам упоўнаважаных па земляўпарадкаваньні, пры правядзеньні падрыхтоўчых прац, весьці агітацыю за пераход да калектыўных форм землякарыстаньня, арганізоўваць беднату для абароны яе інтарэсаў, імкнуцца прадаставіць ёй магчыма большыя льготы і прывілеі пры надзяленьні зямлёй (якасьць, аддаленасьць зямлі), весьці працу па разьвіцьці пасялковых форм землякарыстаньня, абмяжоўваючы адрубную і хутарскую.

Шырэй разгарнуць працу па правядзеньні масавых агрыкультурных мерапрыемстваў, як ачыстка насеньня, засеў чыстасортным (сэлекцыйным) насеньнем, раньні папар, разьвіцьцё травасеяньня, засеў тэхнічных культур, распаўсюджаньне мінэральных угнаеньняў, выцясьненьне сахі і замена яе плугам і г. д. Пры гэтым ячэйкі, у залежнасьці ад умоў свайго раёну, павінны ставіць перад сабой практычныя, найбольш важныя для данага раёну ці вёскі, гаспадарчыя заданьні, напрыклад: «дабіцца поўнай ачысткі насеньня ў вясеньнюю пасеўную кампанію», «перавесьці на шматпольле па працягу году столькі-та дзесяцін», «у такі-то тэрмін выцясьніць саху, замяніўшы яе плугам» і г. д. і сканцэнтраваць на выкананьні гэтых заданьняў сілы ячэйкі і беспартыйнага актыву.

Арэндныя адносіны на вёсцы павінны быць вывучаны з большай увагай ячэйкамі. У першую чаргу ячэйкі павінны весьці працу па аб'яднаньні ў калектывы беднякоў, якія здаюць зямлю ў арэнду з прычыны адсутнасьці інвэнтару. Трэба арганізаваць беднякоў-здатчыкаў для абароны больш выгодных для іх умоў арэнды. Сачыць, каб падаткі за арэндную зямлю беднякоў плацілі арандатары, а ня здатчыкі.

Паміма пералічаных вышэй задач, разьлічаных на доўгі тэрмін, перад сельячэйкамі ў даны момант стаіць рад задач вялікай важнасьці.

Ячэйкі павінны правесьці кампанію па пытаньні пасьпяховага правядзеньня хлебазагатовак і загатовак сырцу: узмацніць растлумачальную працу аб значэньні нашага экспарту для гаспадарчага аднаўленьня краіны, сачыць за працай хлебазагатоўчых пунктаў, прымаць меры, каб калхозы, саўхозы і партыйцы прадавалі лішкі свайго хлеба дзяржаўным і каапэрацыйным загатоўшчыкам. Сачыць за тым, каб вясковыя каапэратывы своечасова дастаўлялі прамтавары, каб сялянам, якія прадаюць свой хлеб дзяржаўным і каапэрацыйным загатоўшчыкам, адпускаліся тавары ў першую чаргу, садзейнічаць заключэньню зьдзелак на здачу сялянамі хлеба каапэратыву ў крэдыт пад тавары. У адносінах хлеба загатовак сельскія камуністыя павінны быць прыкладам для ўсяго сялянства, яны першыя павінны везьці лішкі свайго хлеба на ссыпны пункт.

Спагнаньне з сялянства належных дзяржаве плацяжоў зьяўляецца другой важнейшай задачай дня. Неабходна разьвіць энэргічную працу па спагнаньні сельска-гаспадарчага падатку, страхоўкі, нядоімак усякага роду, спагнаньня паявых узносаў, завічавачанасьці па крэдытных пазычках каапэрацыі.

Самым рашучым чынам разьвіць працу па прыцягненьні сялянскіх зьберажэньняў у ашчадныя касы, па распаўсюджаньні дзяржаўных пазык, разьвіцьці ўкладных апэрацый у каапэратывах. Вакол пазыкі ўзмацненьня сялянскай гаспадаркі павінна быць разгорнута шырэйшая кампанія.

Неабходна таксама павесьці працу па разьвіцьці ініцыятывы насельніцтва ў правядзеньні самаабкладаньня на мясцовыя культурныя і гаспадарчыя патрэбы.

Праводзячы ўсю гэту працу, сельячэйкі павінны памятаць, што яны толькі тады пасьпяхова могуць справіцца з выкананьнем задач, якія стаяць перад імі, па гаспадарчым перабудаваньні вёскі, калі змогуць прыцягнуць да выкананьня гэтых задач беспартыйны сялянскі актыў і шырокія мас беднаты і серадняцтва.

І. Дарохаў.

*) Гл. „Зьвязду", №№ 16 і 17.

Ці дабіліся мы гібкага і таннага апарату

Рэдакцыя „Зьвязды“ адкрывае абмен думкамі па пытаньнях далейшай рацыяналізацыі савецкіх устаноў

Просьба да ўсіх савецкіх парт'ячэек, членаў эканомкамісій, працаўнікоў апарату і рабкораў выказацца на старонках нашае газэты

ПРОЙДЗЕНЫ ТОЛЬКІ ПЕРШЫЯ КРОКІ

Гібкага па праверцы і вывучэньні дзейнасьці рэарганізаванага савецкага апарату зараз разгарнулася на ўсёй БССР. Гэтай работай займаюцца акрамя РСІ, кіраўнікі ўстаноў, партыйна-савецкая грамадзкасьць, эканомкамісіі, парт'ячэйкі і г. д.

У бліжэйшы час (праз 1-2 месяцы) трэба будзе ўжо падвесьці вынікі праробленай работы і аформіць канчаткова новыя прапановы ка далейшым спрашчэньні работы савецкага апарату.

Мы лічым своечасовым зараз-жа распачаць абмен думкамі на старонках друку. Трэба зараз-жа распачаць абмен нашым вопытам і праз друк даваць свае меркаваньні, свае канкрэтныя прапановы аб рацыяналізацыі работы апарату, аб зьнішчэньні паралельных і наогул лішніх работ, аб удасканаленьні тых ці іншых галін працы.

Азнаямленьне РСІ з працай апарату ў новых умовах паказала, што праведзеная ў мінулым годзе значная работа па рэарганізацыі савецкага апарату ня ўсюды і не заўсёды прайшла гладка. Шмат дзе маюцца скажэньні, недарэчнасьці і, галоўнае, недагаворанасьць.

Напрыклад, што павінен рабіць інспэктар наркамату, перабудаванага на функцыянальнай структуры? Якія яго правы і абавязкі? Якія справы можа інспэктар вырашаць без санкцыі наркома?

Гэтае вострае пытаньне ў розных наркаматах вырашаецца парознаму, яле яшчэ ня маецца ні пэўнай інструкцыі аб функцыях, правох і абавязках інспэктароў, ні разьмежаваньня іх працы з працай наркомаў.

Зусім ня вырашана пытаньне аб парадку праходжаньня спраў у наркаматах і, наогул, ва ўстановах. Хто якія справы павінны вырашаць, які шлях праходзіць паперa, хто адказвае за выкананьне справы і г. д.

Калі мы гаворым аб значных посьпехах у галіне рацыяналізацыі, гэта не азначае, што мы скончылі працу. Наадварот, рэзалюцыі XI-га партыйнага зьезду і вышэйшых урадовых устаноў гавораць аб тым, што намі зроблены ў гэтай галіне толькі першыя крокі, што патрабуецца доўгая і ўпартая барацьба за далейшае спрашчэньне апарату.

Пераходжу да паасобных наркаматаў і ўстаноў.

Вышэйшыя ўрадовыя ўстановы (прэзыдыум ЦВК, кіраўніцтва спраў СНК і Эканомнарада). Галоўнае поле рацыяналізатарскае работы—тут у галіне вывучэньня праходжаньня спраў праз гэтыя ўстановы. Тут трэба высьветліць магчымасьць спрашчэньня паралку вырашэньня спраў, зьмяншэньня колькасьці інстанцый, разгрузкі вышэйшых устаноў ад дробязных пытаньняў.

Наркамфін і Наркамзем—гэта наркаматы з значнай пэрыферыяй і разнастойнымі галінамі працы. Яны патрабуюць вялікай доўгай работы па ўдасканаленьні і спрашчэньні апэрацыйных працесаў дзейнасьці, па перадачы раду функцый ніжэйшым інстанцыям.

У мінулым годзе шмат зроблена ў **Наркамаце Унутраных Спраў.** Зараз трэба паглыбіць праведзеную працу па дэцэнтралізацыі, па зьнішчэньні паралелізму. Ужо такі лёс гэтага наркамату, што ў сваёй рабоце ён сутыкаецца амаль што з усімі наркаматамі і акрвыканкомамі. Трэба ўставіць пэўныя межы яго працы і ўзаемаадносін з іншымі ўстановамі.

У Вышэйшым Савеце Народнай Гаспадаркі трэба разьмежаваць работу ВСНГ і трэстаў.

Па **НКЮ** трэба будзе, па-першае, разьмежаваць работу НКЮ і Вярхоўнага суду. Падругое, спрасьціць тэхніку работы суду і пракуратуры, пераглядзець існуючыя працэсуальныя нормы.

У мінулым годзе ЦСУ была рэалізавана: спрошчана структура, зьнішчан паралелізм у працы. Але большая частка работы яшчэ ўперадзе. Трэба перабудаваць працу так, каб лепш абслугоўваць наркаматы як у адносінах зьместу матар'ялу, так і тэрмінаў яго прапрацоўкі. Трэба пачаць рэалізацыю пастановы аб паступовай дэцэнтралізацыі статыстычнай работы.

Нарэшце, трэба вывучыць пытаньне аб спрашчэньні статыстычнай справаздачнасьці, аб метазгодпасьці існуючай статыстычнай сыстэмы.

Вось некаторыя заўвагі аб рацыяналізатарскай рабоце ў будучым.

Я. Ракаў.

НЕ ЧАКАЙЦЕ, ПАКУЛЬ ПРЫДЗЕ РСІ

„Танна і гніла“—буржуазная мараль

Старая буржуазная, гандлярская прымаўка гаворыць: „дорага ды міла, танна ды гніла“. Ангельскія ґерды прыдумалі яшчэ больш „мудрую“ пагаворку: „я не настолькі багат, каб купляць танную рэч“.

Наш Савецкі Саюз, які сваімі сіламі, без усякай дапамогі з боку, будуе новае жыцьцё, імкнецца выжыць з белага сьвету гэту буржуазную мараль. Мы не настолькі багаты, каб дазволіць сабе раскошу—траціць лішню капейку. Мы змагаемся за танны добры тавар, мы даюць вялікіхахвяр дабіваемся спрашчэньня і патаненьня дзяржаўнага апарату. Ёсьць у нас і спэцыяльная ўстанова, якая займаецца гэтым—Рабоча-Селянская Інспэкцыя.

Што зроблена ў галіне рацыяналізацыі апарату? Гэтаму пытаньню быў прысьвячан даклад т. Ракава на агульна-гарадзкой канфэрэнцыі служачых адміністрацыйных устаноў.

Ня толькі скарачэньне, але і спрашчэньне

Як працуюць у новых умовах скарочаныя апараты? Ці спрошчана праца, ці справа абмежавалася толькі скарачэньнем штатаў? Ці хутка вырашаюцца пытаньні ў рацыяналізаваных установах? Як выконваюцца дырэктывы вышэйшых органаў? Вось важнейшыя пытаньні сучаснага дня, якімі займаецца Р. С. І.

Праверка вынікаў праробленай працы—галоўная задача сучаснасьці.

Трэба праўду сказаць, ня ўсё яшчэ зроблена ў галіне рацыяналізацыі. Нашы вышэйшыя ўстановы яшчэ загружаны дробнымі справамі. Нашы буйныя наркаматы—Наркамфін і Наркамзем—яшчэ не дабіліся поўнага пераходу на функцыянальную сыстэму адказных выканаўцаў. Мы можам яшчэ шмат функцый перадаць акруговым і раённым органам. Трэба шукаць далейшыя шляхі дэцэнтралізацыі апарату.

Апарат чапляецца за старыя формы

Спрэчкі па дакладу т. Ракава выявілі рад цікавых момантаў рацыяналізатарскай працы ва ўстановах.

Наркампрацы аддаў шмат часу і энэргіі на справу рацыяналізацыі, ня мала гадзін патраціла на гэта і эканомкамісія. Што-ж выйшла? Наркампрацы СССР скасаваў пляны па спрашчэньні справаздачнасьці і прапанаваў «не соваться суконным рылом в калачный ряд». У апошнія часы ён прыслаў рад дадатковых форм справаздач, на якія прыходзіцца траціць шмат часу. Вось табе і на!

Наркампрацы прапанавана нават заняцца абкладаньнем, кацёльным зборам. Пізавы апарат скарочан да граніц магчымасьці, а яму яшчэ навязваюць новую непатрэбную працу. Бывае цяпер, што на адной і той-жа справе прыходзяць на прадпрыемства і інспэктар працы, і фінагент. Вось вам і зьнішчэньне паралелізму.

Канъюнктурнае бюро Дзяржпляну загромаждае наркаматы формамі справаздач, якія ў штодзённай рабоце не распрацоўваюцца.

У НКУС увезена інспэктура. Але чамусь-ці старшы інспэктар кіруе малодшымі, накладвае рэзалюцыі і нічым не адрозьніваецца ад ранейшага загадчыка аддзелу. Дзе тут функцыянальная сыстэма?

Шмат прыкладаў прывялі прамоўцы. Усе адзначалі адно: самой масе служачых трэба ўзяцца за справу рацыяналізацыі. Работа ня можа адмежавацца пераменай шыльду.

Аў. Бутомаў.

На пленуме ЦСПСБ

Касы ўзаемадапамогі

Новыя формы сябе апраўдалі.—Кіраўніцтва касамі з боку прафарганізацый яшчэ нездавальняючае.—Трэба ажывіць саветы кас.—Пераход на крэдытныя функцыі

На ранішнім пасяджэньні 26 студзеня пленум заслухаў даклад заг. аргаддзелам ЦСПСБ тав. Каплана аб працы кас узаемадапамогі.

З дакладу высьвятлілася, што рэарганізацыя кас узаемадапамогі на падставе звароту членам кас часткі членскіх узносаў і арганізацыя кас на прадпрыемствах—сябе апраўдала. У выніку правядзеньня рэарганізацыі палепшылася абслугоўваньне ўсіх груп удзельнікаў кас. Але разам з тым аслабла кіраўніцтва і ўплыў з боку саюзных органаў з прычыны чаго маецца цэлы рад вялікіх недахопаў у працы кас. Раней прафарганізацыі „апякалі“ гэтыя касы, а калі яны перайшлі на новыя формы працы, прафсаюзы амаль што зусім адмовіліся ад іх кіраўніцтва. У выніку касы былі прадстаўлены самім сабе. Касы пры выдачы ссуды выходзілі з прынцыпу неабходнасьці, а не звароту. Дзякуючы гэтаму, кваліфікаваная частка рабочых ня ішла ў касы, бо не атрымлівала ад іх дапамогі.

Ня гледзячы на досыць доўгі час існаваньня саветаў кас, апошнія яшчэ не разгарнулі сваю працу, а ў некаторых буйных касах саветы зусім ня ўтворваны. Прафсаюзныя арганізацыі павінны зьвярнуць увагу на ажыўленьне працы саветаў у буйных касах, на рэгулярнае іх скліканьне і на іх інструктаваньне.

Па дакладу выказаўся рад таварышоў, якія падзяліліся практычай працы кас.

У вынесенай рэзалюцыі пленум даў дырэктывы па далейшай практычнай рабоце кас узаемадапамогі.

Пленум лічыць магчымым перавод на крэдытныя функцыі кас узаемадапамогі з прадастаўленьнем ім крэдыту з банкаў пры наяўнасьці наступных умоў.

Саюзныя органы павінны ажыцьцявіць гэты пераход з надзвычайнай асьцярожнасьцю. У кожным асобным выпадку пераход неабходна ўзгадняць на месцах з АСПС, а на Менскай акрузе з ЦСПСБ.

Пленум лічыць магчымы выдачу касамі дробных кароткатэрміновых ссуд пры ўмове ўстанаўленьня на гэтую мэту мінімальнага процанту зваротных сродкаў кас з тым, каб гэта не адбівалася на выдачы доўга-тэрміновых ссуд і каб выдачы афармляліся праз праўленьні кас.

Пленум запрапанаваў саюзным органам прыняць меры да поўнага і своечасовага выкананьня дырэктыў прэзыдыуму ЦСПСБ у адносінах кас.

Пленум запрапанаваў адмовіцца ад мэтаду спагнаньня запазычанасьці па ссудах праз утрыманьне адміністрацыяй зарплаты, што практыкуецца да гэтага часу.

Прэзыдыуму ЦСПСБ даручана пасьпяшыць выданьнем закону аднаведным дзяржаўным органам аб прадастаўленьні касам права бясспрэчнага спагнаньня па ссудах, тэрмін якіх прашоў.

З мэтай падзіку вынікаў працы кас на новых падставах і абмену практыкай пленум пастанавіў у гэтым годзе склікаць усебеларускую нараду кас узаемадапамогі.

На вячэрнім пасяджэньні пасьля прыняцьця рэзалюцыі з дакладам аб дзейнасьці рэдакцыйна-выдавецкага аддзелу ЦСПСБ выступіў тав. Ярмінсон.

Новыя калдагавары ў беларускіх тэкстыльшчыкаў

40.000 рублёў на павышэньне зарплаты. — 7-гадзінны дзень па шкодных цэхах

Гэтымі днямі заключаны калектыўныя дагавары па тэкстыльных фабрыках «Дзьвіна» (Віцебск), на 1.800 рабочых, імя Клары Цэткін (Віцебск) —на 450 рабочых і Якаўлевіцкай фабрыцы (Орша) — на 550 рабочых. Зараз праводзіцца тарыфная рэформа. Зарплата адсталым групам рабочых падцягваецца. Для гэтай мэты адпушчана каля 40.000 руб. Павялічаны тэрміны водпускаў па шкодных цэхах.

Павялічаны нормы спэцвопраткі. Упяршыню ўведзены па калдагаворы 7-гадзінны рабочы дзень па шкодных цэхах тэкстыльных фабрык—фарбавальным, ліцейным і для асобных груп рабочых. Саюзу ўдалося дабіцца абсталяваньня вэнтыляцыі і ў вызначаныя тэрміны па ўсіх прадпрыемствах.

Задачы партыі па працы сярод жанчын

З дакладу т. Арцюхінай на сходзе дэлегатак гораду Менску

26 студзеня ў памяшканьні клюбу К. Маркса адбыўся сход дэлегатак гор. Менску, на якім прысутнічала больш 500 жанчын. З дакладам аб чарговых задачах партыі па працы сярод жанчын згодна пастаноў XV зьезду УсеКП(б) выступіла загадчыца аддзелу па працы сярод работніц і сялянак ЦК УсеКП(б) **тав. Арцюхіна.**

XV-ты зьезд нашай партыі—адзін з найвялікшых у яе гісторыі. Нам, пры правядзеньні свае штодзённай працы, гадамі прыдзецца спасылацца на пастановы данага зьезду. Я спынюся на двух пастановах зьезду: на пяцігодцы і кораценька на пытаньні аб працы ў вёсцы.

Мы сваю гаспадарку павінны перарабіць на аснове рацыяналізацыі, нам трэба сваю краіну індустрыялізаваць. Наша партыя ставіць пытаньне аб рацыяналізацыі так, каб кожны рабочы, кожная работніца шырока зразумелі гэтыя задачы. Нам, таму, і трэба паставіць перад сабою задачу шырокага растлумачэньня работніцам аб рацыяналізацыі, трэба паставіць справу так, каб работніца ня толькі хадзіла на вытворчыя нарады, а і ўносіла дзелавыя прапановы, каб яна сама дапамагала рацыяналізацыі. Пры правядзеньні рацыяналізацыі пытаньні кваліфікацыі жаночай працы зьяўляюцца ў нашай працы асноўнымі задачамі.

Што-ж у гэтых адносінах можна зрабіць?

Мы павінны сачыць, каб нашы гаспадарчыя, прафсаюзныя і інш. органы пры складаньні каштарысаў абавязкова ўключалі пункты аб кваліфікацыі жаночай працы, уводзячы гэта ў сыстэму.

З увядзеньнем 7-гадзіннага рабочага дня ўводзіцца начная зьмена рабочых, у якой бязумоўна будуць працаваць і жанчыны. Жанчыны-ж, якія прахадзілі цяжарнымі 5 месяцаў, і жанчыны, якія кормяць грудзьмі дзяцей да 7 м-цу, дапучшацца для працы ў начных зьменах ня будуць.

Задача жанорганаў і ўсіх работніц прасачыць за ажыцьцяўленьнем гэтага закону, разгарнуць шырэй абсталяваньне дзіцячых устаноў, каб жанчына магла вольна, спакойна заняцца на вытворчасьці.

Падагульваючы пытаньне аб удзеле ў вытворчасьці, скажу—уцягваць большы лік жанчын у вытворчасьць, вучыцца працаваць так, як мужчына, кваліфікавацца, браць уд ел у рацыяналізацыі і ва ўсім жыцьці вытворчасьці—наша асноўная задача.

У нас, па СССР, 53 проц. усіх жанчын нявісьменных. З прычыны малапісьменнасьці нашы вылучэнкі жанчыны ня могуць апраўдваць сябе на працы. Шырэй трэба разгарнуць працу на лікпунктах, максымум увагі аддаць павышэньню культурнага ўзроўню, шырэй ахапіць школамі дзяўчынак.

Якія-ж задачы перад намі стаяць у бытавой справе, накіраванай да разьняволеньня жанчыны?

Сталоўкі, дзіцячыя ясьлі і інш. яшчэ ня могуць задаволіць рост запатрабаваньняў. Перад намі стаіць задача, на гэта зьвярнуў увагу і XV-ты зьезд—узмацніць будаўніцтва бытавых устаноў. Мы павінны падштурхнуць саветы і іншыя арганізацыі і ўстановы абгаварыць пытаньне аб бытавых установах. Пры складаньні плянаў будаўніцтва трэба дабівацца ўключэньня ў плены гэтай галіны будаўніцтва. Усе работніцы і сялянкі павінны выявіць максымум ініцыятывы і зацікаўленасьці ў гэтым напрамку.

Спынюся ў кароткіх рысах на пытаньні аб працы ў вёсцы.

Наша вёска не пасьпявае за ростам прамысловасьці. Сыстэма індывідуальнага вядзеньня гаспадаркі не дазваляе прасунуць у вёску сельска-гаспадарчыя машыны, ужыць новыя формы гаспадараньня, таму зьезд і паставіў задачу—узбуйненьня сельскай гаспадаркі—задачу калектывізацыі. Такое пытаньне нашай партыяй ставілася і раней, але мы покуль што ня мелі прадпасылак для ажыцьцяўленьня гэтага мерапрыемства.

Пераварот да новых форм гаспадараньня мы павінны зрабіць і сярод жанчын. Трэба сялянцы растлумачыць аб значэньні калектывізацыі, шырэй уцягнуць у каапэрацыі, капіснуць на ўзьняцьце культурнага ўзроўню сялянак, асабліва батрачак.

Лічу неабходным спыніцца ў канцы яшчэ на некаторых важных момантах.

У партыю зараз уліўся новы кадр пралетараў — кастрычнікавы заклік. У яго складзе мы маем 13,8 проц. жанчын. Гэта лічба невыстарчальная, нездавальняючая. Нам гэты недахват прыдзецца выправіць пасьля закліку. Мы павінны правесьці самаправерку, ці усё, што было лепшага, перадавога ў нашых радох, мы перадалі ў партыю.

У сувязі з міжнароднымі абставінамі мы павінны ўзмацніць абароназдольнасьць краіны, трэба падрыхтоўваць жаночую сілу для працы на фабрыцы, на заводзе, на сельскай гаспадарцы, на кіраўнічай працы па ўстановах, каб на выпадак вайны яна магла-б замяніць мужчыну; мы павінны быць падрыхтаваны да абароны тылу, таксама і навучыцца добра страляць, каб абараняць пралетарскую дзяржаву, якой работніца і сялянка так многа абавязаны.

Вось, таварышы, тая частка, толькі частка, задач, якія перад намі стаяць на бліжэйшы пэрыяд. (Гучныя воплескі).

УСЕБЕЛАРУСКАЯ НАРАДА ПРАЦАЎНІКОЎ ЖАНАДДЗЕЛАЎ

26 студзеня нарада заслухала даклад тав. Крэмер аб выніках перавыбараў дэлегацкіх сходаў і задачах іх працы.

— Кампанія перавыбараў дэлегацкіх сходаў—гаворыць тав. Крэмер—была скарыстана ўсімі арганізацыямі КП(б)Б для растлумачэньня шырокім колам працоўных жанчын чарговых задач партыі савецкай улады і прыцягваньня іх да ўдзелу ўзмацненьня абароназдольнасьці краіны і ўсіх відаў сацыялістычнага будаўніцтва.

Партыйнае кіраўніцтва перавыбарамі дэлегацкіх сходаў было забясьпечана. Гэтая кампанія правядзілася ўсімі партарганізацыямі як сур'ёзная і важная палітычная кампанія, у якую быў уцягнуты ўвесь партыйны актыў. Праўда, былі асобныя выпадкі (Аршанскі райком і Рэчыцкі), калі гэту работу праводзілі толькі жанарганізатары і прафсаюзы.

Перавыбары дэлегатак выклікалі значную ўзросшую актыўнасьць, якая выразілася ў павялічэньні процанту наведваньня сходаў. У горадзе яно раўнялася 53,5 проц., а на вёсцы—47,8 проц. На прадпрыемствах наведваньне сходаў работніц дасягала да 90 проц.

Сацыяльны склад дэлегатак так сама палепшыўся. У горадзе мы маем 61 проц. работніц, а на вёсцы—6,4 проц. батрачак. Значна павялічылася колькасьць біднячак-сераднячак, уцягнута больш работніц і сялянак з нацменшасьцяй.

У гэтым годзе мы павінны будзем—кажа тав. Крэмер,—зьвярнуць асаблівую увагу на пэрыдычныя справаздачы дэлегатак перад прапоўнымі жанчынамі. Гэта кампанія павінна пачацца з лютага месяца.

Неадкладным пытаньнем у дню работы ўсіх дэлегатак зьяўляецца ліквідацыя няпісьменнасьці, арганізоўваючы спэцыяльныя лікпункты пры дэлегацкіх сходах, узмацненьне работы сярод батрачак, уцягненьне ў практычную работу саветаў і саюзаў, большае ўцягненьне ў партыю работніц, батрачак і сялянак-біднячак, узмацненьне работы са старымі дэлегаткамі, згодна даных дырэктыў.

Па дакладу тав. Крэмер у спрэчках выступала 10 чалавек.

27 студзеня нарада заслухала даклады: аб бліжэйшых задачах у працы з жаночым актывам—тав. Танасэўцавай і аб выніках перавыбараў каапэрацыі—тав. Наўлянскага.

Нарада яўрэйскіх працаўнікоў пры ЦК КП(б)Б

26-га студзеня ў залі пасяджэньняў ЦКК КП(б)Б адкрылася ўсебеларуская нарада яўрэйскіх працаўнікоў пры ЦК КП(б)Б.

На першым-жа пасяджэньні нарады быў заслуханы даклад т. Чамярынскага аб працы ЦБ яўрэйскай сэкцыі пры ЦК УсеКП(б). Тав. Чамярынскі ў сваім дакладзе галоўную ўвагу зьвярнуў на ўцягненьне яўрэйскіх працоўных у сацыялістычнае будаўніцтва краіны.

Павялічваецца ўдзельная вага яўрэйскага пралетарыяту ў нашай прамысловасьці, усё мацнейшай і мацнейшай становіцца сувязь яўрэйскай сельскай гаспадаркі з каапэрацыяй і дзяржаўным апаратам.

Расьце палітычная актыўнасьць яўрэйскіх працоўных, але побач з гэ́ю мы маем некаторае ажыўленьне і яўрэйскага нэпмана, дробнага буржуа. На грунце гэтага пачынае разьвівацца яўрэйскі клерыкалізм.

У канцы свайго дакладу т. Чамярынскі спынецца на стане і далейшых задачах працы сярод яўрэйскіх саматужнікаў.

Са справаздачай аб працы яўрэйскага бюро ЦК КП(б)Б выступіў тав. Бэйлін. Ён падрабязна спыніўся на ўсіх галінах партыйнай працы сярод яўрэйскага насельніцтва.

На буйных прадпрыемствах Беларусі зараз працуе 6 тыс. чалавек яўрэйскіх рабочых, на чыгунцы, дзе раней зусім ня было яўрэяў, цяпер працуе 237 рабочых яўрэяў.

У галіне разьвіцьця яўрэйскай сельскай гаспадаркі нам трэба будзе ў далейшым праводзіць усю працу ў напрамку аб'яднаньня яўрэйскіх гаспадарак і іх калектывізацыі.

Па дакладах т. т. Чамярынскага і Бэйліна разгарнуліся ажыўленыя спрэчкі.

Як праходзяць загатоўкі

Загатоўчая работа яшчэ не ўпарадкавана

ВІЦЕБСК. (Уласны кар.). Абсьледваньнем некаторых раёнаў Віцебшчыны ўстаноўлена, што нашымі загатоўчымі арганізацыямі яшчэ далёка ня ўсё зроблена для посьпеху загатовак экспартнага сыраду.

Дзякуючы пяўмеламу кіраўніцтву, многія нізавыя каапэрацыйныя арганізацыі повна прыступілі да загатоўчай працы. Ёсьць такія арганізацыі, асабліва па лініі спажывецкай каапэрацыі, якія яшчэ да гэтага часу недаацэньваюць значэньне загатовак другарадных экспартных прадметаў.

Сельсаюз выканаў сваё заданьне прыблізна на 50 проц. Белдзяржгандаль і спажывецкі саюз хоць і дабіліся поўнага выкананьня сваіх плян ў, але большасьць загатоўленых імі тавараў (асабліва гэта адносіцца да спажывецкай каапэрацыі) ня зможа быць рэалізаванай на замежным рынку.

Бяда заключаецца ў тым, што загатоўшчыкі рабілі націск на асноўныя віды сыраду і хлебапрадукты і прамаргалі такія важныя другарадныя тавары, як пушніна, пух, пер'е, яйкі, лекавыя травы і г. д.

Н.

Прыцягненьне да адказнасьці

Наркамгандаль БССР атрымаў весткі аб тым, што ў Буда-Кашалёўскім раёне спажывецкія і с.-г. таварыствы вядуць яшчэ загатоўку бульбы па павышаных цэнах і гэтую бульбу адпраўляюць у Ленінград.

Наркамгандаль аддаў распараджэньне Габруйскаму акргандлю катэгарычна забараніць гэтым арганізацыям вываз бульбы і вінаватых прыцягнуць да судовай адказнасьці.

Толькі ў апошнія дні заварушыліся

РАГАЧЭЎ. (Уласны. кар.). Дагэтуль дзяржаўныя каапэрацыйныя органы ў нас яшчэ не вялі ніякай працы па загатоўцы хлеба і сыраду. Прычына гэтаму тая, што мы адносіліся да гэтых «драбніц» нядбайна.

Калі становішча з хлебам тут абстаіць ня вельмі добра, дык для загатоўкі сыраду ў нашым раёне ёсьць шырокае поле дзейнасьці. Але бяда ў тым, што прасолы, якія маюць дазвол райадм яленьня весьці загатоўку, з закупленага сыраду крыху адчаюць адзяленьню, а рэшту прадаюць прыватніку. У вёсцы В.-Крушынаўка адзначан наступны факт—каапэрацыя купляла віёркі па 1 р. 10 к. за штуку, але тут зьявіўся прыватнік-спэкулянт і, накінуўшы 5 кап. на штуку, забраў у паляўнічых сотні віёрак.

Я. С.

Аблігацыя ў руках селяніна—

пасьведчаньне яго удзелу у сацыялістычным будаўніцтве

Беднякі—першыя пакупцы

ВОРША. У Пячынкоўскім сельсавеце па кожнай вёсцы праведзены сходы сялян, на якіх ставіліся даклады аб значэньні пазыкі. Тут-жа на сходзе сяляне купілі аблігацыі. Купляла большаю часткай беднота, кулакі-ж (вёска Ўмыркі) адмаўляюцца. У невялікай вёсцы Казіна сяляне купілі аблігацый на 25 руб. Старык-бядняк 70 гадоў купіў аблігацый на 2 р. 50 к. На сходах ужо рэалізавана аблігацый на 87 р. 50 кап.

Яшчэ ня ўсе вёскі ведаюць аб пазыцы

Падрыхтоўка да рэалізацыі пазыкі разгарнулася ў Менску і па акругах, але да раёнаў яшчэ не дакацілася. Ёсьць такія вёскі, якія яшчэ зусім нічога ня ведаюць аб пазыцы. Мясцовыя газэты зьмяшчаюць матар'ял аб пазыцы на апошняй старонцы і дробнымі літарамі, замест таго, каб самім з'арганізаваць спаборніцтвы паміж раёнамі і сельсаветамі, каб кожны дзень высьвятляць пытаньне аб ходзе кампаніі. Сялянства не ўяўляе сабе яшчэ ўсёй важнасьці гэтай кампаніі. Усё гэта гаворыць аб тым, што ўсю трудасьць кампаніі трэба перанесьці на вёску. **Ф.**

200.000 рублёў на прэміі лепшым сельсаветам

Заўтра выяжджаюць на акругі прыехаўшыя з Масквы прадстаўнікі Наркамфіну СССР. Яны наведаюць Бабруйскую, Магілеўскую, Віцебскую і Полацкую акругі, абсьледуюць па два раёны ў кожнай акрузе і, прыблізна, па 2 вёскі ў кожным раёне. Усюды будуць праведзены сходы і праверана апэрацыйная і агітацыйная праца. У гэтай рабоце павінна брацьудзел вясковая інтэлігенцыя — доктар, аграном, настаўнік.

Усе раёны будуць мець права ўдзельнічаць ва ўсесаюзным конкурсе на лепшы раён і сельсавет, які найбольш шпарка і на найбольшую суму рэалізуе пазыку. **Для гэтае мэты па Беларусі асыгнавана 200.000 руб. на прэміі. Прэміі будуць выдавацца—сельска-гаспадарчымі машынамі, трактарамі, гатунковаю жывёлаю, выяснымі коньмі. Сярод прэмій будуць дзьвюграшовыя прэміі на пабудову школы ці больніцы.**

Збор паявых узносаў—галоўная задача

Спажывецкая каапэрацыя Беларусі сканцэнтравала за апошнія два тыдні на загатоўчыя апэрацыі і на зборы капіталаў выключную ўвагу. Задача баявая —трэба ўзмацніць тэмп загатовак, а таксама ў працягу 2-3 месяцаў сабраць ня менш 500.000 р. паявых капіталаў у нізавой сельскай сетцы. Гэта ў значнай ступені ўзмоцніць прыцёк уласных сродкаў, якія павінны быць асноўнымі і рашаючымі ва ўсім каапэрацыйным звароце.

Праўленьне Белкаапсаюзу, райсаюзы, спажывецкія таварыствы змаглі ўцягнуць для правядзеньня збору паявых капіталаў і ўзмацненьня загатовак увесь свой каапэрацыйны актыў. Калі за гэту справу ўзяліся па сапраўднаму, вынікі пачынаюць зараз-жа праяўляцца.

Першая беглая зводка за 20 дзён студзеня, атрыманая з месц, па няпоўных вестках, бо ўсіх сельскіх спажывецкіх таварыстваў па Беларусі налічваецца 650, а зводкі атрыманы прыблізна толькі ад двух пятых усяе колькасьці спажывецкіх таварыстваў, — гаворыць аб значным росьце тэмпу загатовак і зьбіраньня паявых капіталаў.

Вынікі загатовак за гэтыя 20 дзён студзеня па Менскім, Бабруйскім, Полацкім і Віцебскім райсаюзах такія: хлебных культур загатоўлена 66.751; ільнянога семя—9.444; ільну—1.240; скурсырцу—17.368; экспарттавараў—90.752. або 6,6 проц. Слуцкае аддзяленьне Белкаапсаюзу—5.383 р. або 15,3 проц. Усяго паявога капіталу сабрана 47.296 р. або 11,9 проц.

Такім чынам, за першыя 20 дзён студзеня сабрана паявых капіталаў звыш 47.000 руб. **Трэба мець на ўвазе, што больш паловы спажывецкіх таварыстваў не ўвайшлі ў гэту зводку.** Таму, каб атрымаць сапраўдны вынік сабраных паявых капіталаў па сельскай сетцы на 20 студзеня, трэба гэту суму па меншай меры падвоіць. Якія вывады алгэтуль можна зрабіць? Ці зьяўляюцца паданыя лічбы доказам узмацненьня тэмпу прыцёку паявых капіталаў? —Бясспрэчна. Калі прыняць пад увагу, што кожны з папярэдніх кварталаў даваў прырост паявых капіталаў у сярэднім на 15-20 проц., дык за гэтыя першыя 20 дзён студзеня тэмп прыросту паявых капіталаў, прыкладна, падвоіўся. Але гэтага мала. Трэба ня толькі падвоіць, але ўдзесяцярыць усю работу па зьбіраньні паёў, бо перад каапэрацыяй задача заключаецца ў тым, каб уласныя сродкі моцна пацясьнілі пазычаныя сродкі ў балянсе.

Побач з усім гэтым выявіўся цэлы рад недахватаў.

Перш а ўсе ня ўсе раёны зразумелі неабходнасьць дакладнага і тэрміновага выкананьня заданьняў. Сюды адносяцца Гомельскі саюз, які да гэтага часу не прадставіў вестак аб першых дзьвюх дэкадах. Па тэмпе зьбіраньня паявых капіталаў на апошнім месцы знаходзіцца Бабруйскі саюз. Ён павінен абавязкова падцягнуцца і дагнаць другія раёны.

Потым неабходна адзначыць, што паявая кампанія дае пакуль яшчэ вынікі, галоўным чынам, у мястачковых спажывецкіх таварыствах. У вёсцы яна яшчэ не разгарнулася, як трэба. Трэба спусьціцца ніжэй —у сяло. Уся работа па зборы паёў павінна перакінуцца ў глыбіню вёскі.

Прыватнік і кулак у зьвязку з разгарненьнем кампаніі распаўсюджваюць усякія чуткі аб тым, што такі цьвёрды і рашучы курс па зборы паёў і па ўзмацненьні загатовак — тлумачыцца крахам спажывецкай каапэрацыі. Гэта сьведчыць аб тым, што ворагі савецкае ўлады прабуюць правакацыйнымі чуткамі сарваць нашу работу.

Сярод цэлага раду іншых недахватаў, якія выявіліся ў працягу гэтых першых двух 10-дзёвак, трэба адзначыць асабліва недахваты нашага нізавога каапэрацыйнага апарату, які мае яшчэ пэўную коснасьць і нярухлівасьць, які прызвычаіўся яшчэ працаваць «на авось», без ініцыятывы, без адпаведнай энэргіі і выстарчальнае сьвядомасьці важнейшых задач, якія стаяць перад намі. Частка інструктарскага апарату таксама апынулася не на вышыні. Ход выкананьня гэтых задач дазваляе зрабіць наступныя асноўныя вывады: заданьні могуць і павінны быць выкананы,— тэмп усёй работы трэба ў шмат разоў павялічыць; неабходна дабіцца таго, каб уся каапэрацыйная грамадзкасьць была пастаўлена на ногі, каб прыцягнуць ініцыятыву і самадзейнасьць саміх пайшчыкаў.

Пасьпяховы ход усёй паявой кампаніі будзе на бліжэйшы пэрыяд служыць галоўнай меркай моцнасьці і нармальнага разьвіцьця каапэрацыі.

Асабліва трэба ўяснiць, што перад намі стаіць ня толькі задача сабраць 500.000 руб. паявых капіталаў у другім квартале.

Наша задача, галоўным чынам, заключаецца ў тым, каб уся бягучая кампанія паслужыла пачаткам далейшага непарыўнага прыцёку ўласных сродкаў у каапэрацыйны тавараварот.

І. Ф—н.

У ПРЭЗЫДЫУМЕ ЦВК БССР

Дзейнасьць Вышэйшага Савету Фізычнай Культуры

Прэзыдыум ЦВК пастанавіў: прапанаваць Наркаматам і Выканаўчым Камітэтам зьвярнуць больш увагі на работу саветаў фізкультуры; саветам фізкультуры больш абхапіць гурткамі рабочую і сялянскую моладзь, а таксама і дарослых працоўных, дзеля чаго шырэй разгарнуць масавую фізкультурную работу; узмацніць тэмп ваянізацыі гурткоў фізкультуры; прапанаваць акруговым выканаўчым камітэтам прадугледзець у плянах будаўніцтва—пабудову памяшканьняў і пляцовак для заняткаў гурткоў; даручыць Наркамасьветы і Вышэйшаму Савету Фізкультуры прапрацаваць пытаньне аб арганізацыі Тэхнікуму Фізкультуры па падрыхтоўцы інструктароў; Наркамзему, Менскаму АВК сумесна з Вышэйшым Саветам Фізкультуры распрацаваць пытаньне аб пабудове ў Менску цэнтральнага стадыёну для масавых фізкультурных мерапрыемстваў; лічачы неабходным наблізіць усёй фізкультурнай работы да нацыянальнага складу займаючыхся, прапанаваць ВСФК і Інбелкульту пасьпяшыць з перакладам фізкультурнай тэрміналёгіі на беларускую, яўрэйскую і польскую мовы і ўключыць у сыстэму работы гурткоў — нацыянальныя гульні і скокі.

Прысваеньне тав. Грыгор'еву годнасьці „Гэрой працы"

Прэзыдыум ЦВК пастанавіў прысвоіць б. манцёру дэпо Менск тав. Грыгор'еву, Піліпу Рыгоравічу, годнасьць «Гэрой працы».

Тав. Грыгор'еў працаваў на вытворчасьці 50 год, мае таксама заслугі перад Кастрычнікавай рэвалюцыяй.

Беларусізацыя культурных устаноў

(У Нацкамісіі ЦВК БССР)

Нацыянальная камісія ЦВК БССР пастанавіла даручыць Наркамасьветы: а) сродкі, адпушчаныя II-й Сэсіяй ЦВК БССР VIII-га склікаць для выдавецтва ў суме 150.000 руб., а таксама сродкі, якія будуць асыгнаваны на гэту справу Саюзным Урадам, скарыстаць на пашырэньне выдавецкае справы па выданьні масавай літаратуры і падручнікаў як на беларускай мове, так і на мовах інш. нацыянальнасьцяй БССР.

б) Распрацаваць канкрэтны плян пераводу на беларускую мову выкладаньня ў Вышэйшых Навучальных Установах БССР і ўстанавіць кантроль за выкананьнем пляну.

Прыняць меры да прыцягненьня да працы лепшых навуковых працаўнікоў беларусаў, якія працуюць у інш. рэспубліках СССР, а таксама павясьці плянавую падрыхтоўку новых навуковых працаўнікоў для беларускіх вышэйшых навучальных устаноў і пасылку ў замежныя дзяржавы для навучаньня найбольш здольных, палітычна вытрыманых якія ведаюць беларускую мову, быт і асаблівасьці Беларусі, па тых галінах навуковай працы, у якіх патрэбны высока кваліфікаваныя навуковыя працаўнікі для ВНУ БССР.

Інстытуту Беларускае Культуры даручана прыняць меры да скарэйшай падрыхтоўкі беларускай навуковай тэрміналёгіі для Вышэйшых Навучальных Устаноў БССР.

Кіраўніком цэнтральных гаспадарчых устаноў і транспарту БССР даручана ў самы найкарацейшы тэрмін пад іх асабовую адказнасьць закончыць беларусізацыю падпарадкаваных ім устаноў. Нацкамісіяй будзе зроблена праверка выкананьня гэтае пастановы.

У Савеце Народных Камісараў БССР

(Аб'яднанае пасяджэньне СНК і Эканамічнай Нарады за 25 студзеня г. г.)

Аб капітальных укладах у народную гаспадарку

На гэтым пасяджэньні па дакладу т. Валаковіча (Дзяржплян) была прынята пастанова аб фінансаваньні і доўгатэрміновым крэдытаваньні капітальных мерапрыемстваў у паасобных галінах народнай гаспадаркі.

Капітальныя ўклады павінны накіроўвацца, гал(оў)ным чынам, на ўзмацненьне асноў(ных і) зваротных капіталаў прамысловасьці, электрабудаўніцтва, а такса(ма) ў сельскую гаспадарку па лініі ўзмацненьня трэставаных савецкіх гаспадарах, дзяржаўных прадпрыемстваў і прадпрыемстваў рэспубліканскай і мясцовай прамысловасьці, якая перарабляе прадукты сельскай гаспадаркі, у асноўныя капіталы сыстэмы сельска-гаспадарчага крэдыту, на земляўпарадкаваньне, меліярацыю, культуртэхніку і на стварэньне калёнізацыйнага фонду. Капітальныя ўкладаньні ў сельскую гаспадарку будуць таксама накіроўвацца і па лініі індывідуальных сялянскіх гаспадарак: набыцьцё рабочай і племяннай жывёлы, на дастаўку машын, на трактарызацыю і на іншыя патрэбы індустрыялізацыі сельскай гаспадаркі, а разам з гэтым на ўсе віды агранамічна-вэтэрынарнага і іншага (гасп)адарча-культурнага абслугоўваньня сельскай гаспадаркі. Капітальныя ўкладаньні павінны яшчэ больш узмацніць сувязь паміж прамысловасьцю і сельскай гаспадаркай.

Капітальныя ўкладаньні будуць таксама накіроўвацца на кватэрнае і іншае будаўніцтва, на добрабыт гарадоў, на ўзмацненьне капіталаў і зваротных сродкаў дзяржаўна-гандлёвых прадпрыемстваў і на ўзмацненьне сродкаў каапэрацыйных арганізацый.

Фінансаваньне капітальных укладаньняў робіцца як за рахунак уласных вакапленьняў, таксама і за рахунак дзяржаўнага і мясцовага бюджэту, крэдытных фондаў і іншых крыніц.

Аб разьвіцьці ўкладных апэрацый у сельска-гаспадарчай крэдытнай каапэрацыі

У сувязку з неабходнасьцю прыцягнуць мясцовыя сродкі ў сыстэму сельгаспадарчага крэдыту для ўзмацненьня крэдытаваньня сельгаспадаркі, СНК прызнаў, што сыстэма сельска-гаспадарчага крэдыту павінна зрабіць усе захады, каб у працягу 1928 г. сума ўкладаў у нізавой сетцы дасягнула 1 млн. руб. Для гэтага СНК вызначыў наступныя мерапрыемствы: пашырыць нізавую сетку сельска-гаспадарчых крэдытных таварыстваў, каб зацікавіць насяленьне ва ўкладных апэрацыях, сельска-гаспадарчым крэдытным таварыствам дазваляецца вы(плачва)ць па ўкладах: паасобным укладчыкам да 12 проц. гадавых, а установам і арганізацыям да 6 проц. Усім установам і прадпрыемствам, якія працуюць на вёсцы, дазваляецца хаваць свае вольныя сродкі ў сельска-гаспадарчых крэдытных таварыствах. Пад страхам крымінальнай адказнасьці забаронена разгалашаць каму-б та ні было весткі аб укладчыках і аб унесеных імі ўкладах.

Арганізацыя вытворчасьці мэталёвай галянтарэі.

Прэзыдыум ВСНГБ згадзіўся з прапановай прамыслова-эканамічнай управы аб арганізацыі пры заводзе „Чырвоны Кастрычнік" вытворчасьці мэталёвай галянтарэі.

Мэталатрэсту даручана ўзьняць пытаньне перад Аршанскім акрвыканкомам аб пракладцы шашы—дарогі Вуршa-Барань.

Канчатковым тэрмінам пуску новай галянтарэйнай фабрыкі ўстаноўлена першае верасьня 1928 г. Новая фабрыка па сваім маштабе зьявіцца адной з буйнейшых у СССР у гэтай галіне.

МЕНСК

Сьвяткаваньне гадавіны заснаваньня Ленінскага інстытуту

26-га студзеня ў канфэрэнцзале ІБК адбылося ўрачыстае пасяджэньне, прысьвечанае гадавіне заснаваньня Беларускага Дасьледчага Інстытуту сельскай і лясной гаспадаркі імя Леніна.

На ўрачыстасьць сабраліся навуковыя працаўнікі Інстытуту, прадстаўнікі Інбелкульту і шмат гасьцей. Ад ЦВК і ЦК КП(б)Б прысутнічалі т.т. Чарвякоў і Васілевіч.

З дакладам аб гадавай працы Навукова-Дасьледчага Інстытуту і яго чарговых задачах выступіў дырэктар Інстытуту тав. Гарэцкі.

Гісторыя дасьледчай справы на Беларусі,—кажа дакладчык,—зьвязана з адбіткам рэвалюцыйнага будаўніцтва яе сельскае гаспадаркі, зьвязана з адбіткам гісторыі будаўніцтва самой Беларусі.

Характарызаваць тып сельскай гаспадаркі БССР можна як жывёлаводны, інтэнсыўна-мясны з прамыслова-тэхнічным паляводзтвам. Дзяржаўнае і грамадзкае будаўніцтва сельскай гаспадаркі Беларусі накіравана да разьвіцьця і аднаўленьня сельскай гаспадаркі, яе калектывізацыі, каапэраваньня, індустрыялізацыі і павялічэньня таварнасьці.

Сваю работу Інстытут праводзіць у кантакце з навукова-дасьледчымі ўстановамі БССР і іншых саюзных рэспублік, а таксама ўстанаўляе сувязь з адпаведнымі навуковымі ўстановамі іншых краін.

У арганізацыйных адносінах Інстытут узгадняе і пляную працу ўсіх падсобных сваіх станцый.

З дакладам аб рэгуляваньні воднага рэжыму Беларускага Палесься выступіў праф. Дубах, які спыніўся на рэгуляваньні і мэліяраваньні нашых беларускіх рэчак. Асабліва цікава было ім пастаўлена пытаньне штучнага арашэньня і дажджаваньня ў Беларусі, якое ўжо праводзіцца ў Нямеччыне. Дзякуючы асобным тэхнічным машынам і прыладам праз асобныя разбрызгвацелі з вадаёму можна падаваць ваду ў пэўныя вучасткі (штучны дождж) і такім чынам дабіцца пастаянства ўраджаю.

Былі таксама заслуханы прывітальныя тэлеграмы ад розных навуковых устаноў Беларусі і РСФСР.

З прывітальным словам ад імя беларускага ўраду выступаў тав. Чарвякоў.

У канцы сходу быў заслуханы даклад праф. Мельніка аб навукова-дасьледчай працы па лясной гаспадарцы ў Нямеччыне і Францыі.

Новыя вытворчасьці на Беларусі

Лесбел карэнным чынам перабудоўвае свае гомельскія заводы. На гэтых заводах намечаны арганізацыі новых вытворчасьцяй—абознае, паркетнае і калодачнае. Для выпрацоўкі пляну пераабсталяваньня заводаў у Гомель выяжджаюць спэцыялістыя Лесбелу.

Дармовыя электрычныя ўводы ў кватэры рабочых

Утворана камісія ў складзе прадстаўнікоў гарсавету, ЦСПСБ, Эльводу і Камгасу пад старшынствам т. Пасынкоўскага для разьмеркаваньня 1000 дармовых электрычных ўводаў у рабочыя кватэры. Гэтыя дармовыя ўводы абсталёўваюцца ў аднаку 10-ці годзьдзя Кастрычніцкай рэвалюцыі. Парадак разьмеркаваньня ўводаў будзе апублікаваны ў бліжэйшыя дні.

Кватэрныя сталы пры аддзяленьнях міліцыі

У мэтах разгрузкі камгасу ад працы па выдачы ардэроў на жылплошчу і палепшаньня вучоту 30-ці процантнай нормы, прэзыдыум гарсавету парашыў дэцэнтралізаваць кватэрны стол. Пры кожным аддзяленьні міліцыі будзе арганізаваны кватэрны стол для правядзеньня ўсёй працы па выдачы ардэроў і вучоце 30-ці процантнае жылое плошчы. Гаспадарчая частка працы (кватэрная плата, рамонты) пакідаецца за камгасам.

Адвод вучасткаў для шматкватэрных дамоў

Гарсавет пастанавіў адвесьці Белжылсаюзу для пабудовы новых шматкватэрных дамоў пляцы на рагу вуліц Карла Маркса, каля сталоўкі ЛКСМ, на Чырвонаармейскай вул. і на рагу Рэвалюцыйнай і Рэспубліканскай вуліц.

Падрыхтоўка да будаўнічага сэзону

Белсельбанк адпусьціў выканкомам і каапэрацыйным арганізацыям каля 700.000 рублёў для загатоўкі будаўнічых матар'ялаў да надыходзячага будаўнічага сэзону. Загатоўкі матар'ялаў праходзяць пасьпяхова. Заключаны дагавары на дастаўку неабходных матар'ялаў.

Адчыненьне палітэхнікуму

У зьвязку з вырашэньнем пытаньня аб адчыненьні фізкультурнага тэхнікуму ў Магілеве, дзе ўжо маецца акушэрскі і фармацэўтычны тэхнікум, мяркуецца адкрыць адзін палітэхнікум, які будзе падзяляцца на тры аддзяленьні—акушэрскае, фармацэўтычнае і фізкультурнае. Палітэхнікум будзе адкрыты ў Магілеве.

«СПОРТ»

Што дала ўсебеларуская спартакіяда

Усебеларускае сьвята на зімовым спорце праводзіцца першы раз у рэспубліканскім маштабе,—гэта зьяўляецца для Беларусі навінкай. Калі дасягненьні ўсебеларускай спартакіяды параўнаць з дасягненьнямі іншым Саюзных рэспублік, то яны вельмі мала адстаюць. Вынікі ваянізаваных прабегаў на 10 кілёмэтраў са стральбой паказалі, што ваянізацыя ў гуртках фізкультуры займае адно з відных месц, бязумоўна забясьпечыць работу па абароне нашай краіны.

Выяўлены дасягненьні па падняцьці цяжару і барацьбе, якія паказалі таксама добрыя дасягненьні, але трэба адзначыць, што гэтыя віды спорту шмат у якіх акругах не знаходзяць масавага прыстасаваньня,—гэта тлумачыцца адсутнасьцю памяшканьняў для заняткаў па цяжкай атлетыцы і барацьбе.

Зімовая спартакіяда прыцягнула грамадзкую думку ў адносінах фізкультуры. Спартакіяда таксама дала поўную магчымасьць беспамылкова адабраць лепшых фізкультурнікаў на ўсесаюзную спартакіяду.

На ўсесаюзную спартакіяду ВСФКБ накіроўвае 35 чал.

ВСФКБ зараз займецца прапрацоўкай вынікаў арганізацыі, уводзячы ў сыстэму фізкультуры работу масавых мерапрыемстваў, якія зьяўляюцца моцным сродкам прапаганды значэньня фізкультурнага выхаваньня працоўных.

У.

Фізкультурны тэхнікум у Магілеве

На пасяджэньні калегіі НКА вырашана пытаньне адносна адчыненьня фізкультурнага тэхнікуму з будучага навучальнага году.

Тэрмін навучаньня, навучальны плян і праграмы для 1-га курсу даручана сялсьеці метадкому.

Мэтавая ўстаноўка тэхнікуму дасьць кваліфікаваных практычных працаўнікоў і кіраўнікоў фізычнага выхаваньня для асьветных устаноў НКА, а таксама кіраўнікоў гурткоў для прафсаюзных клюбаў і іншых грамадзкіх арганізацый.

Фізкультурны тэхнікум мяркуецца адкрыць у Магілеве.

Дагавор з Гарсаветам.

Паміж ЦП саюзу працасьветы і гарсаветам заключан калектыўны дагавор на ўсе культурныя ўстановы, якія знаходзяцца на гарадзкім бюджэце.

Паводле гэтага дагавору ўпарадкавана справа з наймам і звальненьнем. Тэхнічныя працаўнікі ўсіх культурна-асьветных устаноў, загадчыкі школ сацвыху, садоў і ачагоў забясьпечаны кватэраю, апалам і сьвятлом.

Ільготнае крэдытаваньне беднаце

Белсельбанк пераве́ў на ільготнае крэдытаваньне ў фонд беднаты па акругах 142.180 руб. Грошы разьмеркаваны наступным чынам: Ворша—20.000 руб., Бабруйск—25.000 р., Віцебск—15.000 р., Гомель—17.000 руб., Магілеў—20.000 руб., Мазыр—15.000 р., Полацак—15.000 руб. і Менск—15.180 руб.

ЗА ДЗЕНЬ

УСЕБЕЛАРУСКІ ЗЬЕЗД МЭДСАНПРАЦЫ. Сёньня ў Менску адкрываецца ўсебеларускі зьезд саюзу Мэдсанпрацы.

ПЕРАДАЧА САВЕЦКАЙ ГАСПАДАРКІ. Савецкая гаспадарка Санжаны ў гарадзкой лініі, якая знаходзілася пад ведамам Страхкасы, перадана Менсельпрому.

РОСТ РАБОЧАЙ КААПЭРАЦЫІ. За апошні час лік пайшчыкаў МЦРК павялічыўся ад 22.995 да 30.233. Паявы капітал павялічыўся на 58.971 р. або на 78 проц.

УСЕБЕЛАРУСКАЯ ВЫТВОРЧАЯ КАНФЭРЭНЦЫЯ ХАРЧАВІКОЎ. На 29-га студзеня ў Менску склікаецца ўсебеларуская вытворчая канфэрэнцыя Белхарчтрэсту.

АРГАНІЗАЦЫЯ ЛАТО. Прэзыдыум гарсавету дазволіў упаўнаважанаму цэнтральнай дзіцячай камісіі адкрыць у Менску лато. Усе зборы з лато пойдуць на ўтрыманьне дзіцячых ясьляў і барацьбу з беспрытульнасьцю.

70 НОВЫХ КВАТЭР. Прэзыдыум гарсавету пастанавіў здаць „Торгстрою" працу на пабудове новага дому на 70 кватэр. Для гэтага дому адводзіцца пляц на рагу Камсамольскай і Унівэрсытэцкай вуліц.

ВЫЙГРЫШЫ ПА ПАЗЫЦЫ ІНДУСТРЫЯЛІЗАЦЫІ. Дагэтуль у беларускую кантору Дзяржбанку прад'яўлена 135 аблігацый, на якія папалі выйгрышы на агульную суму 8.050 р. Сярод гэтых выйгрышаў 11 па 250 р.

Лекцыя прафэсара Туркэльтауба

У аўторак, 31-га студзеня, у клюбе Карла Маркса адбудзецца лекцыя праф. І. С. Туркэльтауба на тэму: „Антысэмітызм і яўрэйскае пытаньне".

Судзячы па водгуках прэсы, партыйных і прафэсыянальных арганізацый, лекцыя праф. Туркэльтауба прадстаўляе вялікі інтарэс для шырокіх мас.

ШАХМАТЫ

Пад рэдакцыяй Шукевіча-Трэцьцякова.

Задача Ніколо Сардога „Ботцэя"



Белыя даюць мат у дзесяць хадоў: 1. Cf1—a6+, Kb1 2. Л:b1+, Лc1 3. Л:c1+, Kd1 4. Л:d1+, Ce1 5. Л:e1+, g2—g1 (пешка робіцца любой фігурай) 6. C:b7+, Лc6 7. C:c6+, Фd5 8. C:d5+, e4 9. C:e4+, f3 10. C:f3×

Задача Эйнзідлэра фон Цірнаў „Сялянская вайна".

Белыя пачынаюць і даюць мат у чатыры хады.

Гэтая задача разьвязваецца так: 1. Kf3—g5, f6:g5 2. Cg3—e5, d6:e5 3. Лa1—e1, d2:e1 4. Лd1—d8.

СУД

Фальшывая зьдзелка

Чаховіч Міхась мае ў Менску уласны дом і сваю каўбасную. Гандаль у яго ішоў бойка. Звароты ніштаватыя. Але нешта Чаховіч усё чухае патыліцу. Фінаддзел паложыў на яго 3.186 руб. падаходнага. Частку платы Чаховіч уносіць, ад рэштакі адмаўляецца.

Бяда, дзеткі, колькі ні гандлюй, а частку свайго прыбытку як у ваду выкідаеш, скардзіўся ён у сваёй сям'і. Фінаддзел падаткамі нас гандляроў давіме. Плаці яму і падаходны і цалевы.

Аднойчы Чаховіч прыходзіць да дому ў вясёлым настроі.

— Ведаеш што, сынок, давай мы перапішам дом на цябе, што быццам ты купіў яго ў мяне. Тады да нас ніхто ня прывяжацца.

І Чаховіч перапісвае сваю каўбасную майстэрню на сына і адначасова перапрадае яму свой жылы дом.

Але сын з бацькам жывуць разам.

Менскі акруговы суд паводле заявы фінаддзелу ўстанавіў, што Чаховіч сапраўды перапрадаў свой дом і каўбасную сыну каб выкруціцца ад падатку.

Суд пастанавіў анулёваць гэтую зьдзелку як фіктыўную і перадаць дом Чаховіча пад загад Камгасу.

Круцель

Надыходзіла перавыбарчая кампанія. Новікаў Мікола, будучы за старшыню сельсавету, павёў так справы, што бедната і серадзякі зусім адвярнуліся ад яго.

Новікаў адчуваў, што дні яго ў сельсавеце палічаны. Сяляне настроены супроць яго.

На выбарах кандыдатура Новікава была правалена, за старшыню сельсавету абралі Храловіча.

Моцна нездаволены застаўся такімі нечаканымі вынікамі Новікаў.

Ён украў з сельсавету 10 кніг метрычных выпісаў.—Вось які надбайны ваш старшыня, усе кнігі парасьцягаў, мабыць грашкі за сабою чуе, калі так робіць, весела перад сялянамі выказаўся Новікаў.

Сьледзтвам устаноўлена, што сапраўды па мэтрычных выпісях ня ўсё было ўпарадку, асабліва з аплатаю гербавага збору, але за час дзейнасьці ў сельсавеце не Храловіча, а Новікава.

Выязная сэсія Бабруйскага акруговага суду ў Слуцку прыгаварыла Новікава на 2 гады зьняволеньня. Вярхоўны суд пакараціў гэтую кару напалову.

„Зьвязда" дапамагла

«Наглядальнік» у сваёй заметцы зазначаў на нядбайныя адносіны да выкананьня службовых абавязкаў кальцавога агента—разносчыка Старобінскага паштова-тэлеграфнага аддзяленьня т. Чэпурка—несваячасовую здачу карэспандэнцыі, затрыманьне тэрміновых лістоў на тры з палова ю тыдні і г. д.

Бабруйская акруговая кантора сувязі факты, паказаныя ў заметцы, устанавіла, у зьвязку з чым на агента т. Чэпурка ўскладзена адміністрацыйнае пакараньне—вымова з папярэджаньнем, што пры паўтарэньні гэткіх зьявішч ён будзе зьняты з пасады і прыцягнут да судовае адказнасьці.

У газэце „Зьвязда" за № 290 была зьмешчана заметка «Свая кашуля» аб тым, што ў Чарняўскай каапэрацыйнай краме (Барысаўскі раён) старшыня праўленьня т. Лібензон узяў на працу сваячку гр. Красьнік, у якасьці прыказчыцы крамы.

Згодна паведамленьня Барысаўскага РВК гр. Красьнік 5-X-27 г. зьнята з працы.

Факты па заметцы т. „Чудака" аб пяганіне, аб незаконным уключэньні ў лік едакоў грамадзянкі Г. Шкор, — пацьвярдзіліся.

Згодна пастановы Самахвалавіцкай раённа-падатковай камісіі з сьпісу Г. Шкор выключаны 4 едакі, падатак пераличан. Г. Шкор прыцягваецца да судовай адказнасьці.

Адказы рабселькорам і чытачом

П. ПІКУЛІК. Калі вы зьвярачаліся ў школьны савет і вам адмовілі, падайце скаргу ў акраддзел народнай асьветы.

М. КАЛАСОЎСКАМУ. Калі гр-н пасьля сканчэньня тэрміну арэнды ня возьмецца за вядзеньне сваёй гаспадаркі, дык райземкамісія павінна адабраць ад яго зямлю і перадаць безьзямельным ці малазямельным.

Я. БЕРДНІК. Ці мае права селянін загарадзіць дарогу ўсёй вёсцы? —Ня мае права. Падайце скаргу ў РВК.

Г. ГАВРОНУ. Куды зьвярнуцца з просьбаю паслаць на курорт?

— Зьвярнецеся ў раённы выканаўчы камітэт, дзе атрымаеце падрабязны адказ—тлумачэньне на ваша запытаньне.

Х. САРНОВУ. Дзе можна купіць у расрочку швэйную машыну?

— Зьвярнецеся ў Дзяржшвеймашыну (Менск, Ленінская, 15).

С. РАБЧОНАК. Ці мае права на частку маемасьці жонка пасьля разводу?

— Мае права. Трэба падаць заяву ў раённую зямельную камісію.

А. КАСЬЦЮКЕВІЧ. Якія тэхнікумы існуюць у Беларусі і ўмовы паступленьня ў іх.

— Умовы паступленьня ў тэхнікумы знойдзеце ў „Праграме для паступленьня ў ВНУ і тэхнікумы", якая прадаецца ў магазынах Белдзяржвыдавецтва.

Паведамленьні

— АПА Менакругкому КП(б)Б паведамляе, што ў панядзелак, 30-га студзеня, а 7-й гадзіне ўвечары, у Цэнтральным габінэце агітпрапработы адбудзецца сход т. т., выпісваючых «Завочны Камунівэрсытэт». На абвестцы дня: „Формы і мэтады працы завочнікаў". Просьба ўказаным т. т. прыйсьці сваячасова.

— МАКК просіць зьявіцца на пасяджэньне парттройкі МАКК, якое адбудзецца 2-II-28 г., а 6-й гадз. увечары (Энгельса 28), наступных таварышоў: 1) Гурвіча Е. (раней працаваў у НКП, у цяперашні час у п.-к.), 2) Марголіс (яч. хлебапякарні ЦРК), 3) Захарэвіч (яч. заводу «Варшавянка»), 4) Пятніцкага (яч. КП(б)Б пры шпалернай ф-цы імя Вароўскага), 5) Бляхэра (яч. сельгасмайстэрань), 6) Даніэўскую і Раговіну (яч. падсобн. майстэрні БДВ), 7) Раўбэ (раней працаваўшага на біржы працы).

Старшыня МАКК Мундаў.

Адказны рэдактар Ян АСЬМОЎ

ТЭАТР і КІНО

Беларускі Другі Дзяржаўны тэатр	Нядзеля, 29 студзеня „КАЛЯ ТЭРАСЫ", драма ў 4-х дзеях, з часоў 1917 году. Пачатак а 8 з пал. гадз.
Кіно-тэатр „Культура"	Мастацкі бытавы фільм „УХАБЫ" Звыш прагр. хроніка Савкіно № 110.
Кіно „Пралетары".	„СУМКА ДИПКУРЬЕРА" Драма ў 7 ч. Пачатак сэа(нс)аў а 6, 7 з пал., 9 і 10 з п. гадз. Каса адчынена ад 5 гадз. увечары. АНОНС! Шестая часть мира. АНОНС!
Кіно „Чырвоная Зорка".	Сусьветны баявік—шэдэўр кіно-тэхнікі і мастацтва „ВАРЬЕТЭ" (WARIETE) трагэдыя з жыцьця акрабатаў у 7 частках. У галоўных ролях: Эміль Янінгс і Ліа-дэ-Путці. Штодзённа 4 сэансы, цэны звычайныя.
Кіно „Інтэрнацыянал".	Дуглас Фэрбэнкс, Мэры Пікфорд, Ігар Ільлінскі ў выдатным фільме „ПОЦЕЛУЙ МЭРИ", у 6 часьц. Звыш праграмы гастролі арт. маск. і ленінгр. эст. У нов. рэп. Е. А. Миратова.

БЕЛАРУСКІ ДРУГІ ДЗЯРЖАЎНЫ ТЭАТР

Аўторак, 31-I — „Цар Максіміліан", народная драма ў 2-х дзеях з інтэрмэдыяй.

Серада, 1-II — „Каля Тэрасы", драма у 4-х дзеях, з часоў 1917 г. Зачынены паказ для саюзу харчавікоў. — Білеты ўсе прададзены. Пачатак а 9 гадз.

Нядзеля, 5-II — „Сон у летнюю ноч", камэдыя ў трох дзеях. Паказ для рабочае моладзі з уступным словам. — Пачатак а 8 з пал. гадз.

ГАСПАДАРЧЫЯ ЎСТАНОВЫ!

Па справах НОВАГА БУДАЎНІЦТВА зьвяртайцеся у — ПРАЕКТНА-ТЭХНІЧНАЕ БЮРО В. С. Н. Г. Бел. Тэлефон 10-40. Менск, Савецкая, 77.

БЕЛАРУСКАЕ ДЗЯРЖАЎНАЕ ВЫДАВЕЦТВА

Бібліятэка Работніцы і Сялянкі

НОВЫЯ КНІГІ:

М. НАЎЛЯНСКІ.—Коопэрацыя і сялянка. 48 стар. Цана 20 к.
Б. А. ГРУНФЭСТ.—Што павінна ведаць раб. і сялянка аб каапэрацыі 30 стар. Цана 13 к.
А. СТАШЭЎСКІ.—Як раб. і сял. кіруе СССР. 60 ст. Цана 20 кап.
Н. ТАНАЕВЦЕВА.—Что надо знать раб. о профсоюзах. 62 ст. Цана 23 к.
М. КАРКЛИН.—Промышленность СССР и БССР. 58 ст. Цана 30 к.

Кніга „Западная Белоруссия" (на расійскай мове) вышла з друку і прадаецца ў КНІГАРНЯХ БДВ. Каштоўныя рэдкія матар'ялы, неабходныя кожнаму, каго цікавіць лёс Заходняй Беларусі. Старонак 210. Цана 1 р. 50 к.

ДА 1-ГА ЛЮТАГА ЗАСТАЛОСЯ ТОЛЬКІ 3 ДНІ

ПРОСЬБА да ўсіх падпісчыкаў ПАДПІСКУ на ГАЗЭТУ **ЗЬВЯЗДА** аднавіць сваячасова, чым будзе забясьпечана акуратная дастаўка.

ПАСТА для ТОЧКИ и ПРАВКИ ЛЕЗВИЙ БРИТВ НОЖЕЙ и др. ИНСТРУМЕНТОВ

ЛАКО

КООПЕРАТИВ „ГАЛЕН-МОСКВА" МОСКВА, УЛ. ГЕРЦЕНА 5.

ТРЕБУЙТЕ ЗЕЛЕНУЮ бандероль для лезвий, бритв и инструментов. ЖЕЛТУЮ бандероль для ножей, ножниц и хозяйственных предметов.

Имеется в продаже во всех магазинах санитарии и гигиены, галантерейных и хозяйственных.

Высылается не менее 2-х коробок.
с ЗЕЛЕНОЙ бандеролью за 2 рубля
с ЖЕЛТОЙ бандеролью за 1 „
При получении полной стоимости (можно марками) за пересылку не платят.

ЗАКАЗЫ, ПИСЬМА и ДЕНЬГИ АДРЕСУЙТЕ: ТЕХНО-ХИМИЧЕСКИЙ ОТДЕЛ КООПЕРАТИВА „Гален-Москва" МОСКВА, УЛ. ГЕРЦЕНА 5. ОТД. 10

АБВЕСТКА Наркамасьветы Беларусі ў згодзе з Аўтадорам 10 лютага г. г. АДЧЫНЯЕ пры Менскай Аб'яднанай Прафтэхшколе **аднагадзічныя аўта-трактарныя курсы** для падрыхтоўкі мэханікаў, аўтамабілістых і трактарыстых. Правілы прыёму можна атрымаць у канцылярыі Аб'яднанай прафтэхшколы, вул. Валадарскага, 5, з 30-га студзеня ад 2 да 3 з пал. гадз. дня. ЗАГАДЧЫК КУРСАЎ.

ПРАДАЮЦЦА старыя газэты, **ГАЗЭТНЫ ЗРЫЎ.** Зварочвацца ў кантору газэты „Зьвязда" з 9—3 гадз.

ПА СПРАВАХ падпіскі і абвестак званіце па тэлефону **7-81.**

Прыйм абвестак у чарговы нумар газэты адбываецца да 2-ое гадзіны дня.

Згубленыя і ўкрадзеныя

наступныя дакументы лічыць несапраўднымі:

Патэнт 2 разр. Розіна З. Д., выданы АКРФА. 1415
Дапрызыўная кн. Вербіцкага К. А., выд. Менваенкаматам. 1416
Сяброўск. кн. Вербіцкага К. А., выд. саюзам рабзямлесу. 1417
Пасьведчаньне Сухавеrx Б. В. 1418
Лекавая кн. Шаблоўскага З. Ф., выданая Менстрахкасай. 1419
Сяброўская кн. Ерковіча Г. Л., выд. саюзам саўгандальслужачых. 1420
Кн. беспрац. Кавасевіча М. М., выданая Менстрахкасай. 1422
Лекавая кн. Еселевіча І. І., выд. Менстрахкасай. 1423
Лекавая кн. Мазаніка М. Ю., выд. Менстрахкасай. 1424
Каапэрац. кн. Абрамовіча М. М., выданая МЦРК. 1425
Пасьведчаньне на права ўладаньня маемасьцю Аксельрода Л. І. 1426
Сяброўская кн. Гуліса М. К., выд. саюзам хэмікаў. 1427
Вайсковая кн. Рэйзіса І. І., выд. Менваенкаматам. 1428

Кошт публікацыі аб згубе аднаго дакументу 50 кап.

Друкарня газэты «Зьвязда»—Менск.
Менск, Галоўліт № 300